175 ТЫСЯЧ ТОН БУЛЬБЫ—ЛЕНІНГРАДУ

СКАРЫСТАЦЬ ДНІ СЬВЯТА

Пралетары ўсіх краў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 302 (4208)
Чацьвер, 5 лістапада
1931 г.
Выходзіць

Максымальна фарсаваць тэмп адгрузкі бульбы

«... Прапанаваць раённым партарганізацыям, саўгастрэстам, Белкалгасцэнтру, Трактарацэнтру і загатоўчым арганізацыям разгарнуць самую актыўную работу вакол выкананьня пляну загатовак, зараз-жа прыняць меры для выпраўленьня дапушчаных скажэньняў у загатоўках, спыніць усякія гутаркі аб нерэальнасьці пляну і ўзяцца за іх сапраўднае бальшавіцкае выкананьне»—вось выразныя катэгарычныя дырэктывы ЦК КП(б)Б, апублікаваныя яшчэ 25-га кастрычніка.

Раённыя і загатоўчыя арганізацыі павінны былі прыняць самыя баявыя меры для хуткага і неадкладнага ажыцьцяўленьня партыйнай дырэктывы.

З часу апублікаваньня пастановы прайшло 10 дзён—тэрмін выстарчальны для таго, каб фарсаваць тэмпы загатовак і адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Рад раёнаў на аснове рашучай барацьбы з апартунізмам, з кулацка-спажывецкімі, месьніцкімі тэндэнцыямі, з недаацэнкай ролі аднаасобнага сэктару ў выкананьні пляну загатовак, з падменай масавай работы голым адміністраваньнем, у выніку сапраўднай арганізацыі калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас для руйнуючага ўдару па кулацтве, дабіліся вялікіх посьпехаў у загатоўцы і адгрузцы бульбы.

ТАЛАЧЫНСКІ раён адгрузіў Ленінграду 704 тоны замест 600, вызначаных плянам.

КЛІМАВІЦКІ раён да тэрміну выканаў дадатковы плян адгрузкі бульбы. Усяго адгружана 1.811 тон. Раён пераключыўся на адгрузку бульбы Маскве. Ударную работу па выкананьні баявога заданьня паказалі загатоўчыя арганізацыі **Бабруйскага раёну** (143 проц.), **Бягомльскага раёну** (103 проц.), **Бярэзінскага** (128 проц.) і г. д.

Аднак, агульныя тэмпы адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам зусім нездавальняючыя і не гарантуюць выкананьня баявога заданьня—да Кастрычніцкіх сьвят скончыць адгрузку. На 4-га лістапада адгружана Ленінграду толькі 72,1 проц. пляну, а разам з Масквой—толькі 71,3 проц. заданьня. 3-га лістапада адгружана Ленінграду толькі 2.470 тон.

Замест асабліва патрэбнага зараз узмацненьня тэмпаў адгрузкі і загатоўкі ў радзе раёнаў наглядаецца расхлябанасьць, безадказнасьць, яўна апартуністычны курс на сажацёк, натураньне кулацка-заможным элемэнтам. Ва многіх раёнах **(Чавусы, Клічаў, Старобін, Уваравічы)** зусім спынілі адгрузку, прыступіўшы да буртаваньня бульбы.

У Койданаўскім раёне за «пошпія тры дні не адгрузілі ні аднаго цэнтнэра. Загатоўшчыкі хаваюцца за шыльдай «замаразкаў», заяўляючы, што, з прычыны халадоў, нельга грузіць бульбу. Загатоўшчыкі зусім не **паклапаціліся аб ацяпленьні вагонаў,** каб папярэдзіць псаваньне прадукцыі. Старобінскі раён дагэтуль адгрузіў толькі каля 30 проц. Раённыя арганізацыі замест баявой работы займаюцца разважаньнямі аб тым, якім арганізацыям і дзе грузіць. Зусім нелапушчальна пастаўлен **улік** паступаючай бульбы.

Клічаўскі раён злачынна зрывае загатоўкі і адгрузку, выканаўшы менш 30 проц. пляну. На радзе загатоўчых пунктаў пануюць самыя агідныя ігнаруючыя адносіны да здатчыкаў прадукцыі.

Да гэтых раёнаў цалкам адносіцца ўказаньне ЦК аб тых арганізацыях, якія не разумеюць «тэй новай абстаноўкі, што стварылася ў выніку нашых посьпехаў у калектывізацыі сельскай гаспадаркі (50 проц.)». Стаўка на самацёк у вышэй пералічаных раёнах па сутнасьці адлюстроўвае кулацкую лінію і зьяўляецца вынікам нежаданьня зразумець новыя формы клясавай барацьбы і тактыку кулацтва.

У радзе калгасаў ёсьць кулацка-спажывецкія тэндэнцыі, якія не сустракаюць руйнуючага адпору з боку мясцовых арганізацый. У калгасе «Морач», Старобінскага раёну, бульбу разьмяркоўвалі па кулацкім прынцыпе—па 350 пудоў на гаспадарку, плянавае-ж заданьне, **між тым,** выканана менш, чым на 10 проц. Праўленьні калгасаў «Чырвоны хлебароб» і «Камунар» таго-ж раёну не здалі амаль ні аднаго цэнтнэра і імкнуцца ў першую чаргу забясьпечыць свае патрэбы. Калгасы Сарачынскага, Чарапоўшчынскага і Глыбачанскага сельсаветаў, Вупацкага раёну, спынілі адгрузку бульбы. Мясцовыя арганізацыі не прынялі рашучых мер, каб на аснове бязьлітаснай барацьбы з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі выканаць дырэктывы партыі па пераключэньні ўсіх раёнаў на адгрузку бульбы для Ленінграду.

У тых раёнах і калгасах, дзе пабальшавіцку адносьліся да забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў, дзе зрэзумелі ўсё гаспадарча-палітычнае значэньне гэтага мерапрыемства, дзе кулацкаму ўплыву, настроям адсталай часткі калгаснікаў процістаўлена шырокая масавая работа,—там плянны адгрузкі і загатовак перавыкопваюцца. Наглядны прыклад—работа нацыянальных польскіх калгасаў «Камунар», «Камінтэрн» і «9-та студзеня», Койданаўскага раёну, «Інтэрнацыянал» і «Пралетары» (Гомель), якія дабіліся бальшавіцкіх тэмпаў загатоўкі і адгрузкі.

Дагэтуль не ліквідаваны факты злачыннага нескарыстаньня паданага пад адгрузку паражняка. Учора ў «Зьвязьдзе» быў прыведзен выпадак нескарыстаньня 123 вагонаў па віне загатоўшчыкаў. Такія адносіны да скарыстаньня транспарту ў момант, калі кожны вагон надзвычай патрэбен, калі прастоі вагонаў б'юць па выкананьні народна-гаспадарчых пляноў,—зьяўляюцца сапраўдным злачынствам і патрабуюць рашучага і суровага разгаваньня судова-сьледчых органаў.

Дні сьвята павінны быць шырока скарыстаны для павышэньня тэмпаў адгрузкі і разгортваньня масавай работы. Трэба бязьлітасна ўдарыць па кулацка-спажывецкіх тэндэнцыях, па спробах згортваньня тэмпаў, па дэмабілізацыйных спасыланьнях на падвор'е, **па імкненьнях буртаваць бульбу да выкачаньня плянаў. Дні сьвята павінны быць днямі знэргічнейшай работы па загатоўцы і адгрузцы бульбы.** На загатоўчых пунктах трэба ўвесьці круглясутачны прыём бульбы; трэба грузіць вагоны ўдзень і ўночы.

Пры ўмове максымальнай мабілізацыі ўсіх сіл і рашучай барацьбы з апартуністамі — праваднікамі кулацкіх настрояў—плян забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў бульбай будзе поўнасьцю выканан.

ЛЁЗУНГІ ДА 14-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

1. Няхай жыве 14-я гадавіна Кастрычніка! Няхай жыве надыходзячы сусьветны Кастрычнік!

2. Рабочыя і работніцы ўсіх краін! Працоўныя і прыгнечаныя калоніі! У дзень 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі вышэй сьцяг Леніна!

3. Пралетары і прыгнечаныя народы ўсяго сьвету! Мацней удар па загніваючым сьвеце! За дыктатуру пралетарыяту! Няхай жыве Камінтэрн—баявы штаб сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

4. Толькі зьнішчэньне капіталізму і перамога сацыялізму пазбавяць рабочую клясу ад крызісу, беспрацоўя, галечы. Прэч капіталізм, няхай жыве сацыялізм!

5. Крызіс у капіталістычных краінах абуджае на гопад сотні мільёнаў беспрацоўных. У СССР ліквідавана беспрацоўе, ідзе няўхільны ўздым жыцьцёвага ўзроўню працоўных. Пралетары ўсіх краін! Зьвяргайце капіталізм, ідзе ца па шляху рабочых СССР!

6. Вязьням капіталу, што пакутуюць у турмах, ахвярам фашысцкага тэрору, прывітаньне рабочых СССР.

7. Імпэрыялісты арганізуюць экономічную блёкаду Савецкага Саюзу, яны падрыхтоўваюць новую вайну супроць рабочых СССР. Пралетары ўсіх краін! На абарону СССР—бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту. Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба рабочых усіх краін супроць імпэрыялістаў!

8. Пралетары ўсіх краін! 2-гі Інтэрнацыянал—злошная апора капіталізму. Ганеце прэч правадыроў сацыял-дэмакратыі і іх «левую» агентуру! Станавіцеся пад сьцяг Ленінскага Камуністычнага Інтэрнацыяналу!

9. Імпэрыялісты Японіі, Эўропы і Амэрыкі праводзяць палітыку разьдзелу Кітаю і задушэньня кітайскай рэвалюцыі. Пралетары ўсяго сьвету! Абаронім кітайскую рэвалюцыю! Няхай жыве рэвалюцыя ў Кітаі! Прэч імпэрыялізм!

10. Няхай жывуць саветы і герайчная Чырвоная армія Кітаю!

11. Толькі савецкая ўлада можа пазбавіць сьвет ад войн імпэрыялізму. Далоў падпальшчыкаў вайны, імпэрыялістаў і сацыял-дэмакратаў. Няхай жыве савецкая ўлада ва ўсім сьвеце!

12. Толькі Савецкі Саюз зьяўляецца сапраўдным і магутным аплотам сьвету. Няхай жыве савецкая палітыка сьвету!

13. У краінах капіталізму расьце хваля забастовак, узмацняецца рух беспрацоўных, расьце новы ўздым рэвалюцыйнага руху. Пралетары ўсіх краін! Згуртуйце свае рады вакол камуністычнай партыі!

14. Няхай жыве Чырвоная армія СССР — узброены аплот сацыялістычнага будаўніцтва, пільны вартавы савецкіх межаў!

15. Посьпехі пяцігодкі — рашучы ўдар па сусьветным капіталізьме. Скончым перамогай пяцігодку ў чатыры гады!

16. Дагонім і перагонім у найкарацей шы тэрмін перадавыя па тэхніцы капіталістычныя краіны! Няхай жывуць бальшавіцкія тэмпы!

17. Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі рашае ўсё. Няхай жыве бальшавіцкая барацьба за ўладаньне тэхнікай!

18. Павысім вытворча-тэхнічную кваліфікацыю рабочых! Створым новых спэцыялістаў з людзей рабочай клясы!

19. Рабочыя мэталюргіі! Сталью і чыгуном умацоўвайце магутнасьць сацыялістычнай індустрыі. Бальшавіцкімі тэмпамі дабейцеся перамогі ў вялікай барацьбе за мэталь!

20. Прывітаньне рабочым Донбасу, якія няўхільна павышаюць здабычу вугалю! Рабочыя вугальных раёнаў, чу вугалю! Рабочыя вугальных раёнаў, сьледуйце прыкладу Данбасу!

21. Рабочыя чыгуначнікі! Наперад за ліквідацыю абязьлічні, за паляпшэньне руху, за ўкараненьне жалезнай дысцыпліны, за поўны посьпех транспарту!

22. У бязьлітаснай барацьбе з рэхлябанасьцю, у барацьбе з бюракратызмам, з коснасьцю даб'ёмся рашаючых посьпехаў у рабоце транспарту!

23. Ударнікам—перадавым барацьбітом за справу сацыялізму—бальшавіцкае прывітаньне! Няхай жыве сацыялістычнае спаборніцтва!

24. Ганьба дэзарганізатарам сацыялістычнага будаўніцтва — лятуном, рэвачом і прагульшчыкам. Няхай жыве пралетарская дысцыпліна ў прамысловасьці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы!

25. Арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў узьнімем калгасны рух на новую ступень, ліквідуем кулацтва, як клясу! Няхай жыве калгаснае сялянства — моцная апора савецкай улады!

Няхай жыве саюз рабочых і сялян, якія будуюць і ўмацоўваюць калгасы!

26. Барацьба за хлеб — барацьба за сацыялізм. Мацней удар па кулаку, па рвачох, па дэзарганізатарах збожжазагатовак! Ні аднаго цэнтнэру прыватніку! За выкананьне пляну збожжазагатовак!

27. Узмацнім гарадзкую гаспадарку! Палепшым быт працоўных! Ператворым гарады ў культурныя, гаспадарча-разьвітыя пралетарскія цэнтры!

28. Прафсаюзы! Бліжэй да мас, у цэх, брыгаду, групу!

29. Зьнішчэньнем дробна-буржуазнай ураўнілаўкі, перабудовай тарыфнай сыстэмы, укараненьнем гаспадарчага разрахунку забясьпечым магутнае павышэньне прадукцыйнасьці працы!

30. Ператворым стаповыя ва ўзорны цэх харчаваньня. Палепшым грамадзкае харчаваньне!

31. Заваршым перабудову работы каапэрацыі тварам да вытворчасьці! Разгорнем савецкі гандаль! Палепшым забесьпячэньне рабочых!

32. Учагнем мільёны рабочых і калгаснікаў у кіраўніцтва дзяржавай! Выкаранём рэшткі бюракратызму ў дзяржаўным апараце!

33. Вышэй сьцяг марксыцка-ленінскай тэорыі! Навуку, усе дасягненьні культуры—на службу разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню!

34. У краіне, якая ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, не павінна быць нявісьменных. Ператворым СССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці!

35. За школу камуністычнага выхаваньня і камуністычнай асьветы. Ажыць цявім усеагульнае пачатковае навучаньне! Падрыхтуем актыўных сьвядомых барацьбітоў за сацыялізм!

36. За ленінскую нацыянальную палітыку, за адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй у СССР.

37. Кастрычніцкая рэвалюцыя разьняволіла работніцу і сялянку. Павысіла ролю працоўных жанчын у грамадзкім і вытворчым жыцьці краіны!

38. Камсамольцы—у перадавыя шарэнгі ў барацьбе за сацыялізм, у барацьбе за індустрыялізацыю, за аўпраўданьне тэхнікай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў!

39. Юныя піянэры! Дзеці Кастрычніка! Будзьце гатовы працягваць і завяршыць вялікую справу Леніна, справу сусьветнага Кастрычніка!

40. Няхай жыве УсеКП(б)—правадыр і арганізатар пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі!

41. Рабочыя, калгаснікі, усе працоўныя! Цясьней рады вакол УсеКП(б), за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы!

42. Далоў дэзарганізатараў сацыялістычнага наступленьня правых і «левых» апартуністаў. Няхай жыве ленінскае адзінства бальшавіцкіх радоў!

43. Пад сьцягам бальшавіцкай партыі, яе ленінскага ЦК наперад да новых перамог! Вышэй сьцяг УсеКП(б)—арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі!

ЦК УсеКП(б)

Сход партактыву менскай партарганізацыі

УЧОРА АДБЫЎСЯ СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б. З ДАКЛАДАМ АБ ВЫНІКАХ КАСТРЫЧНІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б) ВЫСТУПІЎ САКРАТАР ЦК КП(б)Б — ТАВ. ГЕЙ.

У СПРЭЧКАХ ПА ДАКЛАДУ ВЫСТУПАЛІ ТАВ. ТАРАРАЙ (ЗАВ. «БАЛЬШАВІК»), МАСЭЛЯНСКІ (Ф-КА «БЕЛАРУСКА»), ЛАПКОЎ, ДАВЫДОЎСКІ І ЯКАЎЛЕЎ (ЧЫГУНКА), КАЦНЭЛЬСОН І ІНШ.

У АДНАГАЛОСНА ПРЫНЯТАЙ ПАСТАНОВЕ СХОД ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЬЦЮ ЎХВАЛІЎ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ І НАМЕЦІЎ РАД МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДАЛЕЙШАГА ЖАЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ.

Для поўнага скончэньня адгрузкі і загатоўкі бульбы

Увесьці кругласутачны прыём на загатоўчых пунктах. Днём і ноччу грузіць вагоны

У бліжэйшыя дні ўсе раёны павінны рапартаваць партыі і ўраду аб ажыцьцяўленьні баявога заданьня

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду
(У ТОНАХ)

31/X—	1/XI—	2/XI—	3/XI—	УСЯГО
3019	1964	3647	2470	126.306
				72,1 %

Ня гледзячы на зусім выразныя дырэктывы партыі і ўраду аб максымальным узмацненьні загатовак і адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам, рад раённых арганізацый злачынна ігнаруюць гэту справу, не забясьпечваюць сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў кампаніі.

КЛІЧАЎСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ замест 4848 тон бульбы, вызначаных плянам, адгрузіў Ленінграду толькі 1205 тон, Сыстэма райкалгассаюзу, замест 4239 тон, адгрузіла 1248 тон.

Гэтыя прарывы —вынік МАХРОВАЙ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ КЛІЧАЎСКІХ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, поўнай недаацэнкі загатовак бульбы і снабжэньня ёю пралетарскіх цэнтраў, адсутнасьці плянава-арэрацыйнага кіраўніцтва работай нізоўні.

Работнікі загатоўчых баз райкаапсаюзу зусім ня цікавяцца загатоўкамі, нядбайна адносяцца да сваіх непасрэдных абавязкаў. Загадчык прыёмачнага пункту на ст. Войцічы Сінякоў проста зьдзекуецца над здатчыкамі збожжа, бульбы і інш. прадукцыі, прымушае іх чакаць прыёмкі цэлымі днямі. Часта здатчыкі, не дачакаўшыся пакуль прыдзе прыёмшчык і адкрыецца пункт, варочаюцца дадому, ня здаўшы прадукцыі. Так, нядаўна селянін вёскі Жордзіна, прачакаўшы да позьняй ночы прыёмшчыка, вярнуўся дадому ня здаўшы прывезенай прадукцыі.

Такія-ж «парадкі» існуюць і на загатоўчым пункце на станцыі НЯСЯТА. Вага знаходзіцца не на самым пункце, а за два кілёмэтры ад яго. Такім чынам, здатчыкам прыходзіцца хадзіць за 2 кілёмэтры ад прыёмачнага пункту да месца знаходжаньня вагі і назад. Усё гэта выклікае вялікае незадаволень не сярод здатчыкаў.

Былы старшыня райкаапсаюзу ШЫПЕТАЎ, а таксама зьмяніўшы яго новы старшыня — СЕМЯНЦОЎ не зварачалі ніякай увагі на ўсе гэтыя агідныя зьявішчы, якія маюць месца на загатоўчых пунктах і якія прыводзяць да поўнага зрыву загатовак. Праўленьне райкаапсаюзу не мабілізавала свайго апарату на баявое правядзеньне загатоўчай кампаніі, не разгарнула ніякай масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

У СТАРОБІНСКІМ РАЁНЕ існуе яўная НЕДААЦЭНКА РОЛІ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ ў загатоўчай кампаніі. Кіруючыя загатоўчыя арганізацыі нават ня ведаюць, як выконваюць аднаасобнікі заданьне па здачы бульбы.

КАЛГАСЫ гэтага раёну таксама плятуцца ў хвасьце загатовак. На 1 лістапада яны выканалі толькі 14 проц. свайго заданьня па здачы бульбы. РАЙКАЛГАССАЮЗ да гэтага часу ня даў калгасам дырэктыў аб узмацненьні адгрузкі бульбы Ленінграду. Гэтым карыстаецца кулацтва, якое распальвае спажывецкія настроі сярод адсталых калгасьнікаў, вядзе шалёную агітацыю супроць здачы бульбы дзяржаве. Пад кулацкі ўплыў падпадаюць і паасобныя кіраўнікі калгасу. Так, старшыня калгасу «САВЕЦКАЯ МОРАЧ» распарадзіўся аб разьдзеле паміж калгасьнікамі бульбы па кулацкім ядоцкім прынцыпе—350 пудоў на едака. Гэта ў той час, калі калгас выканаў сваё заданьне па здачы бульбы дзяржаве толькі на 16 проц.

У калгасах «КАМУНАР», «ЧЫРВОНЫ ХЛЕБАРОБ», «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ» пануюць такія-ж настроі.

Па СЛУЦКІМ РАЁНЕ плянавае заданьне па адгрузцы бульбы таксама зрываецца. На 1 лістапада раён адгрузіў толькі каля 50 проц. свайго заданьня, прычым, калгасны сэктар—даў толькі 3,2 проц. пляну.

Націску на кулацка-заможныя элемэнты няма. Не ўстаноўлен кантроль за выкананьнем цьвёрдых заданьняў па здачы бульбы. У выніку—па цьвёрдых заданьнях спатнана ўсяго 19 проц. пляну.

Спускае аддзяленьне Белсадгародніны ня выконвае календарных плянаў адгрузкі бульбы Ленінграду са станцыі чыгункі. Райспажыўсаюз і райкаапсаюз даюць аддзяленьню Белсадгародніны ня правільныя ліпбы аб вывазцы бульбы, а аддзяленьне са свайго боку мэханічна, бяз усякай праверкі паведамляе іх адміністрацыі чыгункі для падачы адпаведнай колькасьці вагонаў. У выніку часта ВАГОНЫ ЗАСТАЮЦЦА НЕСКАРЫСТАНЫМІ.

Трэба пакласьці канец бездазнасьці, расхлябанасьці, недаацэнцы загатоўчай кампаніі. Апартуністы—зрышчыкі загатовак і адгрузкі бульбы — павінны прыцягвацца да суровай адказнасьці.

Пазаўчора ў Клічаве пачаўся расгляд справы работнікаў загатоўчых арганізацый, якія дапусьцілі ганебныя прарывы ў загатоўках. СЛУЦКІЯ, СТАРАДАРОСКІЯ загатоўцы таксама прыцягнуты да адказнасьці. Зараз Пракуратура вядзе сьледзтва аб зрыве загатовак у ЧАВУСКІМ, СТАРОБІНСКІМ і ХОЙНІЦКІМ раёнах. Пралетарскі суд з усёй рашучасьцю ўдарыць па бюракратах, апартуністах, якія зрываюць ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб загатоўках і забесьпячэньні пралетарскіх цэнтраў.

На аснове бязьлітаснага змаганьня з кулацкімі, спажывецкімі тэндэнцыямі, шырокага разгортваньня масава-растлумачальнай работы, руйнуючага адпору правым і «левым» апартуністам—агентуры кулацтва ў радох партыі,—даб'ёмся максымальнага фарсаваньня тэмпаў загатовак і поўнага скончэньня адгрузкі бульбы Ленінграду і Маскве да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Увага гаасьці бульбы!

ПУХАВІЧЫ. (БЕЛТА).

Загатоўкі бульбы і збожжа па Пухавіцкім раёне праходзяць надзвычай павольна. Раёну было дана заданьне адгрузіць Ленінграду і Маскве 115 вагонаў, на 1-га лістапада адгружана толькі 17. На прыёмачных пунктах няма нагляду за якасьцю ўдаванай бульбы. Многія здаюць бульбу вельмі дробную і брудную.

На радзе вёсак пляны загатовак бульбы яшчэ не разьвёрстаны. Напрыклад, вёска Ставроўка атрымала заданьне здаць 40 тон, дагэтуль разьвёрстана толькі 30. Няма рашучага націску на кулака, каб прымусіць яго выканаць цьвёрдыя заданьні.

Адзін з перадавых

ЕЛЬСК.

Калгас «Чырвоны востраў» да 1-га лістапада здаў дзяржаве 85 проц. заданьня па бульбе. Калгас займае першае месца і ў адносінах здачы іншых відаў прадукцыі. Ён першым у раёне здаў 50 проц. заданьня па ільнавалакне ў апрацаваным выглядзе.

Такіх вынікаў калгас дабіўся, дзякуючы рашучай барацьбе са спажывецкімі настроямі ў разьмеркаваньні ўраджаю і посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу.

Спыніць галавацяпства загатоўшчыкаў

ХОЙНІКІ.

Загатоўчыя арганізацыі, у пагоні за колькасьцю, зусім забыліся аб якасьці бульбы, якая адгружаецца Ленінграду. Калгасы ў большасьці дастаўляюць бульбу неперабраную і напалову з зямлёю. Загатоўцы, у пагоні за колькасьцю, ня гледзячы на неаднаразовыя пратэсты дзяржінспэктара па якасьці, грузяць гэту бульбу ў вагоны. Бульба павінна быць у дарозе доўгі час і пры такім становішчы, бязумоўна, можа папсавацца.

Трэба прыняць рашучыя меры і спыніць галавацяпства.

МАЛКАЎ.

Прэміяваць лепшых

МСЬЦІСЛАЎ. Правільная расстаноўка сіл, разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва дало магчымасьць калгасам Хадасоўскага сельсавету свалчасова скончыць уборку і здачу бульбы па вызначаных загатоўчых плянах. Тры калгасы гэтага сельсавету пляны перавыканалі. Калгас «Камінтэрн» замест 30, вызначаных плянам, здаў 43 тоны, калгас «Чырвоны будаўнік» замест 30-35 тон, калгас «Ударнік» замест 50 — 55 тон. Некаторыя калгасы высунулі сустрэчныя пляны на 30 проц. За сваячасовае выкананьне плянаў па загатоўках гэтыя калгасы ў дзень Кастрычніцкіх сьвят будуць прэміяваны.

Логінаў.

ЗЯБЛІВА

Не чакаць замаразкаў

Усю трактарную і конскую цягавую сілу замацаваць на ворыве зябі

Саўгасы і калгасы, якія скончылі зяблева, павінны неадкладна арганізаваць дапамогу адсталым

Безагаворачна аднавіць зяблевае ворыва

СТАРШЫНЯМ УСІХ РАЙВЫКАНКОМАЎ

НАСТУПІЎШАЕ ПАЦЯПЛЕНЬНЕ ДАЕ ПОЎНУЮ МАГЧЫМАСЬЦЬ СКОНЧЫЦЬ УБОРКУ БУЛЬБЫ, КОРАНЬПЛОДАЎ, ГАРОДНІНЫ І ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ ЗЯБЛІВА. НЕАДКЛАДНА КАМАНДЫРУЙЦЕ Ў САЎГАСЫ, КАЛГАСЫ І ПАСЕЛІШЧЫ ЎВЕСЬ РАЁННЫ АКТЫЎ УСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ ЎБОРКІ І ПЕРАВОРВАНЬНЯ БУЛЬБЫ Ў МЭТАХ ЗНІШЧЭНЬНЯ СТРАТ. ЛІЧЭЦЕ БАЯВОЙ ГАСПАДАРЧА - ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАДАЧАЙ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗЯБЛІВА І ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ЦАЛІНЫ. ПРАВЕРЦЕ ПЕРАКЛЮЧЭНЬНЕ ЎСІМІ ГАСПАДАРКАМІ ТРАКТАРАЎ, КОНЯЙ НА ЗЯБЛІВА. ДАБЕЦЕСЯ МАКСЫМАЛЬНАЙ НАГРУЗКІ НА ЦЯГАВУЮ АДЗІНКУ. НЕ АСЛАБЛЯЙЦЕ ЎВАГІ ДА ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ЗЯБЛІВА ДА НАСТУПЛЕНЬНЯ МАРОЗАЎ.

Упаўнаважаны СНК
РАЧЫЦКІ.

Трактарацэнтру законы ня пісаны...

Лік трактараў на зяблеве зьмяншаецца

Паводле даных НКЗБ на 30-га кастрычніка плян зяблева калгасным і аднаасобным сэктарамі выкананы на 33,3 проц. Калгасы ўзьнялі 37,1 проц. пляну, аднаасобнікі — 28,8 проц.

Тэмпы ўздыму зяблева па-ранейшаму застаюцца зусім незадавальняючымі. За апошнюю 5-піднеўку мы маем не павышэньне тэмпаў, а наадварот, зьніжэньне іх. Калі за 5-ю пяціднеўку кастрычніка прырост узоранай плошчы складаў 5,4 проц., то за 6-ю ўжо значна менш — 2,6 проц. Асабліва адстаюць наступныя раёны: Бешанковіцкі выканаў плян ворыва толькі на 9 проц., Крычаўскі — 14,3; Брагінскі — 14,4; Плешчаніцкі — 15,6 і Прапойскі — 16,9 проц.

Калегія Наркамзему БССР абавязала Калгасцэнтр, Трактарацэнтр і саўгастрэсты ў 3-хдзённы тэрмін праверыць перакідку цягі на ворыва, каб з дапамогай гэтага зрабіць зрыў у зяблевым ворыве. Аднак, гэтыя ўстановы адносьліся па-наплюйску і пастановы ня выканалі.

На 31-га кастрычніка МТС узьнялі 56,7 проц. зяблева. Сіроцінская МТС узьняла толькі 23,8 проц., Расонская — 27,2, Лепельская — 36,9 і Дубровенская — 38,9 проц.

Хаця МТС па ўздыме зяблева маюць вышэйшы проц., чым сярэдні па рэспубліцы, але-ж гэта ні ў якім разе нас задаволіць ня можа. Аб тым, што МТС мелі магчымасьць зрабіць значна больш таварыць ня прыходзіцца. Аб гэтым гаворыць жывыя факты з работы перадавых МТС. Так, Гарадоцкая МТС узьняла 94,8 проц. пляну, Жыткавіцкая — 80, Аршанская — 72,3 і Танежыцкая — 70,9 проц.

З боку беладдзяленьня Трактарацэнтру ня ўсё зроблена, каб пераключыць 100 проц. трактараў на ворыва, ня гледзячы на тое, што ЦК КП(б)Б паставіў па від упаўнаважанаму беладдзяленьня Трактарацэнтру тав. Каршакевічу. У апошнюю пяціднеўку колькасьць трактараў на зяблеве зьмяншалася ў параўнаньні з 5-й пяціднеўкай кастрычніка. Калі на 25 кастрычніка на ворыве былі заняты 763 трактары, то на 30-га — 744 — 75 проц. трактарнага парку.

Усё гэта патрабуе ад раённых партыйных арганізацый прыняць самыя рашучыя захады да таго, каб скарыстаць наступіўшае пацяпленьне для поўнага выкананьня пляну зяблева. Трэба безагаворачна выканаць дырэктыву ЦК аб пераключэньні 50 проц. коняй і 100 проц. трактараў на зяблева.

Трэба даць самы рашучы адпор клясаваму ворагу і яго агентам — апартуністам, якія імкнуцца спасыланьнямі на «аб'ектыўныя» прычыны (дрэнная падвор'е, недахват цягі і г. д.) сарваць важнейшае мерапрыемства на ўздыме ўраджайнасьці — зяблева.

Саўгасы павінны арганізаваць дапамогу калгасам

РАГАЧОЎ. Зяблевае ворыва па раёне, ня гледзячы на рад дырэктыў РК КП(б)Б, праходзіць зусім нездавальняюча. Калі саўгасы плян зяблева на 30 кастрычніка выканалі на 101,5 проц., то калгасы ўзьнялі толькі 37,9 проц., аднаасобнікі яшчэ менш — 25 проц.

Прычынай такога маруднага ходу гэтай кампаніі зьяўляецца тое, што калгасы ў абсалютнай большасьці не пераключылі цягавай сілы на зяблева. Калгас «Пераможца», Гадзілаўскага сельсавету, плян зяблева выканаў на 25 проц., між тым, коні скарыстоўваюцца не па прызначэньні. І ня дзіва. У праўленьне калгасу пралезьлі заможнікі, якія ўсялякім чынам стараюцца сарваць зяблевае ворыва. Яны бяруць коняй і трымаюць іх па некалькі дзён. Заможнік Зеванеў узяў калгаснага каня і пратрымаў 3 дні.

Кулак і яго агенты вядуць разбуральную работу сярод аднаасобнікаў, каб апошнія ня ўздымалі зяблева. Кулацкая агітацыя пануе асабліва ў тых сельсаветах і вёсак, дзе не вядзецца ніякай растлумачальнай работы. Так, аднаасобнікі в. Турэк не ўзьнялі ніводнага гэктара зяблева і ня думаюць нават аб гэтым, а Гадзілаўскі сельсавет не зварачае на гэта ўвагі.

МТС таксама не пераключыла ўсіх сваіх трактараў на ворыва; ёсьць выпадкі, што па 6 трактараў стаяць цэлыя суткі без работы.

РК КП(б)Б і зямельна-калгасныя органы павінны рашуча ўдарыць па кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў зяблева. 50 проц. коняй і 100 проц. трактараў павінны быць пераключаны на ворыва.

І. С. І Я. Р.

Трактар на ўздыме зяблева.

За прастой трактароў--да адказнасьці

КАПЫЛЬ. Капыльская МТС па 31-га кастрычніка ўзьняла толькі 56 проц. пляну зяблева. У МТС трактары скарыстоўваюцца не па прызначэньні. 30-га кастрычніка 4 трактары былі заняты на перавозцы будаўнічага матар'ялу (жэрдак, дошак). Дырэктар МТС тав. Бягун тлумачыць гэта тым, што быццам трактары буксуюць на полі, дык ён зьняў іх з ворыва.

З боку некаторых трактарыстаў няма ўважлівых адносін да машын. У выніку нядбайных адносін два трактары зусім выведзены са строю толькі таму, што ня вылілі на ноч рады, якая замерзла. Трэба прыцягнуць вінаватых да адказнасьці за прастой трактараў.

МТС—на перадавыя пазыцыі збожжазагатовак!

Перадавыя машына-трактарныя станцыі БССР дабіліся вялікіх перамог на збожжазагатоўчым фронце. На аснове шырокага разгортваньня масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў, рашучага змаганьня з правым і «левым» апартунізмам, руйнуючага адпору кулацкай агітацыі, МТС дабіліся выкананьня і перавыкананьня гадавога пляну здачы збожжа дзяржаве. Церахаўская МТС на 1 лістапада здала 113 проц. гадавога заданьня, Лепельская — 100,1 проц., Аршанская — 97 проц., Мсьціслаўская — 81,9 проц.

Побач з гэтым рад МТС ганебна цягнуцца ў хвасьце збожжазагатовак. Менская, Боркавіцкая і Гарадоцкая МТС не здалі яшчэ нават і 20 проц. свайго заданьня. Гэта вынік апартуністычнай недаацэнкі загатовак з боку паасобных кіраўнікоў МТС, нежаданьня мабілізаваць на сваячасовае і поўнае выкананьне пляну, на барацьбу з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі ў калгасах.

Дубровенская МТС нават не давяла да сваіх калгасаў пляну здачы збожжа. Ні дырэкцыя, ні аграномы ня ведаюць, колькі і якія культуры павінен здаць кожны калгас. Кожную пяціднеўку кіраўніцтва МТС дасылае Белтрактарацэнтру весткі, якія зусім не адпавядаюць сапраўднаму становішчу збожжазагатовак і часта бяруцца проста «са столі».

МТС павінны неадкладна перабудаваць сваю работу, паставіць задачу найхутчэйшай здачы таварных лішкаў дзяржаве ў цэнтры ўвагі. Адстаючыя МТС павінны ўзяць прыклад з перадавых, якія паказалі

Бальшавіцкай барацьбой—

супроць кулацкіх, спажывецка-месьніцкіх тэндэнцый, супроць рвачоў і дэзарганізатараў забясьпечым пасьпяховае выкананьне плянаў загатовак

Тав. Шаранговіч—на пленуме Рагачоўскага РК КП(б)Б

Тав. **Шаранговіч прымаў удзел** ...дзел у работах пленуму Рагачоўскага ...кому КП(б)Б, на якім стаяла пытань... ...ж загатоўках. Пасьля азнаямленьня ...становішчам загатовак у раёне тав. **Шаранговіч выступіў на пленуме з пра**...овай аб задачах пэртарганізацый у ар**...нізацыі загатовак. У сваёй прамове** ...ав. Шаранговіч сказаў:

— Мы падыходзім да сьвяткаваньня XIV гадавіны Кастрычніка з вялікімі ...ьпехамі на ўсіх вучастках сацыялі...стычнага будаўніцтва. Гэтыя дасягнень... атрыманы КП(б)Б у бязьлітасным ...аганьні супроць кулацтва і яго аген...ры — правых эпартуністаў і «левых» ...ібічыкаў. Гроздзьзаныя посьпехі ў ...цыялістычным будаўніцтве—рост кал...саў, саўгасаў, МТС — стварылі вялікія ...агчымасьці для пасьпяховага выка...ньня тых задач, якія пастаўлены пе...д вясковымі партарганізацыямі. Разам ...посьпехамі ў сацыялістычнай рэкан...струкцыі сельскай гаспадаркі мы маем ...адзьнічай вялікі рост актыўнасьці кал...сных мас.

Усе гэтыя ўмовы мы павінны максы...льна скарыстаць для таго, каб па-баяль...шавіцку і ў самы кароткі тэрмін правесьці ...загатоўкі, ад выкананьня плянаў якіх ...лежань далейшыя тэмпы работы на...ай прамысловасьці.

Ход загатовак зьяўляецца нездавальнючым. Цэнтральны Камітэт гэта канстатаваў у сваёй апошняй пастанове і патрабаваў ад усіх раённых партарганізацый дабіцца неадкладнага пералому ў загатоўках. **Цэнтральны Камітэт у сваёй пастанове аб загатоўках патрабуе ад парвійных арганізацый рашучага змаганьня са спажывецкімі і рэвацкімі настрояў, якія зьяўляюцца рэзультатам кулацкай агітацыі.** Цэнтральны Камітэт раўча ўдарыў па рвацкіх і спажывецкіх настроях, якія мелі месца ў **Бепсайгасьсьце і Калгасцэнтры** і ўжыў рад мерпрыемстваў, накіраваных на забесьпячэньне выразнай работы ў гэтых арганізацыях.

Аналізуючы прычыны адставаньня раёнаў у загатоўках, тав. Шаранговіч сказаў:

— Азнаёміўшыся са становішчам загатовак у радзе раёнаў, я вымушан адзначыць, што партыйныя, загатоўчыя і калгасныя арганізацыі на даным вучастку работы дапусцілі самацёк. Яны разьвялюць прыбліжна так: «Мы дасягнулі вялікіх посьпехаў у калектывізацыі і ...му няма чаго клапаціцца аб загатоў...ках. Калгасы самі здадуць хлеб дзяржа...». Асобныя работнікі некаторых пар...йных, загатоўчых і калгасных арганізацый **на ўлічылі тых новых працэсаў, на адбыліся на вёсцы, на ўлічылі но...й тактыкі кулака,** якая накіравана на ...ыў арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, на зрыў загатовак. ...екаторыя парт'ячэйкі не арганізавалі ...шучага адпору кулаку, частка работ...каў страціла клясавую чуласьць.

Тав. Шаранговіч падае рад прыкладаў, якія пацьвярджаюць гэта палажэньне.

Далей тав. Шаранговіч паказаў на тое, ...то ў радзе раёнаў падавычай **марудна ...е спагнаньне цьвёрдых заданьняў** з ...улацка-заможных гаспадарак.

— Азнаямленьне з радам калгасаў, — ...ворыць далей тав. Шаранговіч, — ліш...раз пацьвярджае, што ў радзе калек...тываў распаўсюджаны кулацкія, спажы...вецка-рвацкія настрої. Пад гэтыя настрої ...адпалі і некаторыя кіруючыя работнікі ...лгасцэнтры. ЦК рашуча ўдарыў па ...кіх настроях і патрабаваў, **каб калга...ы ў здачы (продажы) збожжа, бульбы, ...са і ільну дзяржаве паказалі сапраўд...ны ўзорныя прыклады.** Кожны калгас **...ерпшую чаргу павінен выкананць пляны ...загатовак,** а потым прыступаць да ...даньня фуражна-кармавых балянсаў, ...не давялося быць у адным калгасе ...ігілеўскага раёну (Слабодзкі сельса...т). Гэты калгас мае шмат лішкаў сель...а-гаспадарчай прадукцыі. Кіраўнікі ...лгасу прапануюць здаць дзяржаве 5 ...тонаў бульбы, а райкалгасаюз дасы...е паперку з запытаньнем: якія лішкі ...ць у калгасе і што апошні можа ...даць дзяржаве. Гэты факт навочна па...зывае, што такое «кіраўніцтва» загатоў...камі ні ў якім разе ня можа забясьпечыць іх пасьпяховага правядзеньня.

— Яшчэ адзін недапушчальны факт. У Быхаве і Рагачове ў раённых газэтах мне давялося прачытаць артыкул нейкага Рэмскага — **«Кожнаму калгасу — кармавы балянс». ГЭТЫ ПАЛІТЫЧНА-ШКОДНЫ АРТЫКУЛ** агітуе за тое, каб у калгасах неадкладна стварыць кармавыя балянсы і б'е тыя калгасы, якія на прытрымлівацца нормы Калгасцэнтру. Артыкул ніводным словам не ўпамінае аб загатоўках. І гэрш за ўсё тое, што даны надзвычай шкодны артыкул вымяшчаецца пасьля пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб загатоўках пасьля скасаваньня ня правільных дырэктыў Калгасцэнтру. **Як выявілася, гэты артыкул разаслан БЕЛТА для ўсіх раённых газэт. Біваецца ў рассылцы данага артыкулу павінны быць прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці.**

Тав. Шаранговіч падае рад прыкладаў з практыкі работы партарганізацый, падае рад фактаў, якія сьведчаць аб няўменьні некаторых арганізацый па-баяльшавіцку, на аснове шырокага разгортваньня масавай работы арганізаваць загатоўкі.

— Мы ў апошняй пастанове ЦК зьявілі в работы некалькіх сакратароў РК, некаторым далі вымовы за тое, што яны не забясьпечылі пасьпяховага выкананьня плянаў усіх відаў загатовак. Пастанова ЦК стаіць перад партыйнымі арганізацыямі задачу — дабіцца **КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ Ў ЗАГАТОЎКАХ.** Ваш раён у гэтай пастанове не ўпамінаецца. Аднак, вы арабілі зусім правільна, калі прымаеце для сябе адпаведныя выводы з пастановы ЦК, бо тэмпы загатовак у Рагачоўскім раёне нельга прызнаць здавальняючымі. Ваш раён на выкананьне пастановы ЦК аб адпрузцы бульбы Ленінграду да 1 лістапада. Ня выкананы вамі тыя задачы, якія ўскладзены партыяй і па іншых відах загатовак.

Неабходна на працягу бліжэйшых дзён павысіць тэмпы загатовак і да сьвяткаваньня XIV гадавіны Кастрычніка дабіцца рашаючых перамог на гэтым вучастку работы. Трэба неадкладна скончыць капаньне бульбы, памятаючы, што гэта ня вузка-гаспадарчая справа, а справа вялікай палітычнай важнасьці.

— Я ня сумняваюся, што рагачоўская партарганізацыя, вядучы бязьлітасную барацьбу на два фронты, ачышчаючы свае рады ад кулацкай агентуры, мабілізуе шырокія масы калгасьнікаў на выкананьне плянаў ўсіх відаў загатовак,— заканчвае сваё выступленьне тав. Шаранговіч.

Выступаўшыя на пленуме таварышы ў асобе сакратара ЦК тав. Шаранговіча запаўнялі ЦК КП(б)Б, што Рагачоўскі раён ліквідуе адставаньне і будзе рапортаваць пазьнейшаму пленуму ЦК КП(б)Б аб рашаючых перамогах у выкананьні плянаў загатовак.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб праваапартуністычным артыкуле бюлетэню БелТА

1. Адзначыць, што зьмешчаны ў бюлетэні БелТА артыкул (15 кастрычніка) «Кожнаму калгасу — кармовы балянс» арыентуе раённы друк на раздуваньне спажывецкіх настрояў у калгасах, на складаньне дутых кармовых балянсаў, ігнаруе важнейшы абазвязак калгасаў — здачу ў першую чаргу пішкаў дзяржаве.

Даны артыкул зьяўляецца праваапартуністычным дакумантам і поўнасьцю адлюстроўвае інтарэсы кулацтва, якое перайшло да новых мэтадаў барацьбы— зрыву калгасаў з сярэдзіны, процілстаўленьня інтарэсаў паасобных калгасьнікаў пралетарскай дзяржаве.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За зьмяшчэньне ў бюлетэні і рассылку раённым газэтам праваапартуністычнага артыкулу «Кожнаму калгасу— кармовы балянс» рэдактару бюлетэню— тав. Паўлоўскаму Я. абвясьціць суровую вымову. Для ўзмацненьня работы бюлетэню прымацаваць па-заштатнага інструктара Культпропу ЦК КП(б)Б тав. Зюзькова. Прыняць да ведама заяву сакратару друку Культпропу ЦК КП(б)Б аб тым, што выпучана брыгада па дэтальным абсьледваньні работы бюлетэню.

2. За зьмяшчэньне ў раённай газэце «Барацьбіт за калектывізацыю», Плешаніцкага раёну, вышэйадзначанага праваапартуністычнага артыкулу рэдактару газэты тав. Бутэпіну вынесьці вымову. Указаць усім раённым газэтам, што за зьмяшчэньне ўсіх матар'ялаў у газэце рэдактар нясе поўную адказнасьць.

3. Абавязаць цэнтральны, раённы і нізавы друк больш разгарнуць асьвятленьне пытаньня загатовак і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, вядучы рашучую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі.

4. Пастанову апублікаваць у друку.

Пакончыць з пагоняй за голымі лічбамі

Партыйныя ячэйкі **Шклоўскага** раёну да справаздачна-перавыбарчай кампаніі дабіліся значных посьпехаў у аб'яднаньні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. На сёньняшні дзень 50 проц. аднаасобных гаспадарак беднякоў і середнякоў раёну знаходзяцца ў калектывах.

Аднак, нельга сказаць, што партыйныя ячэйкі пасьля дырэктыў цэнтральных парторганаў пераключыліся на ажыцьцяўленьне асноўнай задачы—на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. У радзе ячэек раёну ёсьць яшчэ неразуменьне таго, што арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў зараз зьяўляецца галоўнай вузлавой задачай, ад практычнай рэалізацыі якой залежаць далейшыя посьпехі ў справе калектывізацыі. Аб гэтым гаворыць наступны факт. Партыйная ячэйка, якая абслугоўвае Таўкачоўскі і Лазіцкі сельсаветы, на дакладзе аб выніках пленуму райкому выносіць наступную пастанову:

«У далейшым рашуча ўзяцца ўсёй парт'ячэйцы за далейшую калектывізацыю Таўкачоўскага і Лазіцкага сельсаветаў. Давесьці калектывізацыю ня менш, як да 80 проц. Ва ўсіх калгасах кожнага актывіста прымаць да вёсак і ўсклясьці на іх адказнасьць па калектывізацыі».

Выносячы такую пастанову, партыйная ячэйка **ні аднаго слова не сказала аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў,** аб арганізацыі працы, аб правільным разьмеркаваньні ўраджаю.

Не займалася пытаньнямі арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасу і Касінніцкая парт'ячэйка.

Палітычна-масавай работы сярод калгасьнікаў ячэйка не праводзіць.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія і дэкаліч самаправеркі, які пачынаецца з 5 лістапада, павінны мабілізаваць усю партыйную арганізацыю на практычнае ажыцьцяўленьне вузлавой задачы—на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Я. Н.

Матар'ял для дакладчыкаў да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі*)

Адным з важнейшых палітычных даг...неньняў КП(б)Б зьяўляецца пераклад ...ораў Леніна на беларускую.

З 1-га студзеня 1931 г. па БССР вы...ходзіць 13 цэнтральных і 56 раённых друкаваных газэт, якія выдаюцца на ...мове са старонкамі адпаведных на...ціональных меншасьцей, разгорнута ...тка журналаў і газэт. Усяго на 1930 г. ...БССР выдавалася 20 журналаў. ...тульны разавы тыраж газэт БССР — ...0.000 экз., гадавы тыраж — 88 мільёнаў.

Вялізарны пад'ём актыўнасьці і рэвалюцыйнага энтузіязму рабочай клясы сялянства, у прыватнасьці калгасьнікаў, знаходзіць сваё выяўленьне ў шырокім разгортваньні нізавога друку і абселькораўскага руху. Апрача цэнтральных і раённых друкаваных газэт ...Беларусі выдаецца 60 друкаваных ...таттыражак, дзесяткі шматтыражак, ...ія друкуюцца на шклографах, і дзе...ткі тысяч насьценных газэт. У адным ...лькі Менску налічваецца звыш 1.000 ...сьценных газэт, 19 друкаваных шмат...ражак і г. д.

У дарэвалюцыйны час ледзь-ледзь ...забіваліся парасткі беларускай літара...ры, зараз 5 літаратурных аб'яднаньняў (БелАПП, «Полымя», «Узвышша», ...літ, Аб'яднаньне Чырвон. армії і ...ту, Пралетарская - калгасная) яднаць каля 200 пісьменьнікаў. Заклік ...ірнікаў у літаратуру ўцягнуў звыш ...0 рабочых толькі на адным Менску. ...ацер беларуская літаратура займае ...дзінае месца ня толькі ў агульнай куль...турнай прадукцыі БССР, але і ў куль...турным жыцьці СССР.

Мы маем валікі пад'ём мастацтва на...ыянальнага на форме і сацыялістычна...а на сваім зьмесьце.

У 1931 годзе на Беларусі налічваецца ...Беларускіх дзяржаўных тэатры, дзяр...ўны яўрэйскі і польскі тэатры, дзяр...ўны вандроўны беларускі і яўрэйскі ...атры, арганізаваны беларускі, яўрэй...кі і польскі тэатры рабочай моладзі, ...андроўны тэатр саўгасаў, рабочых, ра...чы тэатр ЦСПСВ, опэрная студыя, ...ржаўны ансамбль народных інструм...нтаў.

Шырока разгортваецца сетка стацыя...арных кіно-ўстановак: у 1931 годзе бы...о 49 стацыянарных кіно-ўстановак пры ...ённых дамох і адна кіно-ўстаноўка ...ры Доме калгасьніка.

Посьпехі культурнага будаўніцтва ...ыш за ўсё ілюструюцца наступнымі лічбамі. Да рэвалюцыі ў сучасных межах БССР на культурнае будаўніцтва расходавалася 15 мільёнаў руб. (у сучаснай валюце), а ў 1931 годзе расходуецца 128 мільёнаў руб.

КП(б)Б дабілася значных посьпехаў у справе беларусізацыі і карэнізацыі ўсяго савецкага, прафэсыянальнага і гаспадарчага апарату, у справе абслугоўваньня нацыянальных меншасьцей на роднай мове.

У дзяржаўным апараце БССР лік беларусаў складае 61 проц. Лік гэты ў раёнах даходзіць да 78 проц. Зьвыш 50 проц. беларусаў знаходзяцца ў гарадзкіх саветах і звыш 90 проц.—у вясковых.

Усяго на БССР на 1930 г. створана 73 нацыянальных, мястачковых і сельскіх саветаў (а ў 1924 годзе было толькі 9): яўрэйскіх—25, польскіх—22, расійскіх—15, латыскіх—5, украінскіх—3, нямецкіх—2 і літоўскіх—1.

Дасягненьні нацыянальна-культурнага будаўніцтва зьяўляюцца вынікам правільнай генэральнай лініі партыі і вялізарнага ўдыму творчай актыўнасьці і рэвалюцыйнага энтузіязму рабочай клясы і асноўных мас сялянства. Яны здабыты ў бязьлітаснай барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і інш. шавінізмамі, актывізацыя якіх зьяўляецца рэзультатам завастрэньня клясавай барацьбы і шалёнага супраціўленьня сацыялістычнаму наступленьню з боку ўсіх варожых нам сіл.

ПАРТЫЯ

Партыя кіравала змаганьнем рабочых мас усіх народаў Савецкага Саюзу ў змаганьні з царызмам. Наша партыя стварыла ў найцяжэйшых умовах нелегальнага змаганьня вопытныя, дысцыплінаваныя і рэвалюцыйныя кадры.

У 1917 годзе, апіраючыся на базы рух рабочых ва ўсіх мясцох, на сялянскую вайну, на нацыянальна-вызваленчыя рухі падняволеных расійскім царызмам і фінансавым капіталам народаў, партыя прарвала фронт сусьветнага імпэрыялізму і прывяла пралетарыят да Кастрычніцкіх перамог. Настаўнік партыі — яе правадыр і арганізатар Ленін, чыё імя нараўні з імем Маркса заўсёды будзе служыць шляхаводнай зоркай пралетарам усяго свету — непасрэдна кіраваў кастрычніцкім паўстаньнем.

Пад кіраўніцтвам Леніна і потым лепшага яго вучня Сталіна партыя справілася з усімі ворагамі пралетарскай дыктатуры, адбіла ўсе атакі, разьбіла трацкістаў, правых і права-«лявацкі» блёк, замацавала панаваньне рабочай клясы на адной шостай частцы зямной кулі, цяпер праводзіць пяцігадовы плян вялікіх работ.

КП(б)Б зьяўляецца часткай гэтай партыі, адным з яе атрадаў. Вядучы сваю лінію ад першых бальшавіцкіх арганізацый, ад Палескага і Паўночна-Заходняга камітэтаў—перайменаваных ў сьнежні 1918 г. у КП(б)Б, — яна прарабіла з сваім вучастку той-жа вялізарны шлях — ад невялікіх падпольных гурткоў да кіраўніцтва масавымі арганізацыямі, ад зьвяржэньня самадзяржаўя да зьвяржэньня капіталу, ад стачак і барыкад, да вялікай сацыялістычнай будоўлі.

Гэты атрад бесьперапынна напаўняецца ўдарнікамі, батракамі, лепшымі прадстаўнікамі калгасьнікаў — першага ліпеня 1927 г. ён складаўся з 25,8 тыс. членаў, 1-га ліпеня 1931 г. — з 51,9 тыс. членаў.

Колькасьць камсамольцаў на Беларусі павялічылася з 1/I 1927 г. па 1/VII 1931 г. у два разы (з 63 тыс. да 120 тысяч).

На трэць партыйная арганізацыя складаецца з кандыдатаў, з ліку членаў партыі трэць належыць да яе самых маладых пластоў. Яны ня маюць самі таго вялізарнага вопыту ў змаганьні з клясавым ворагам, у змаганьні з апартунізмам унутры партыі, які накоплены ўсёй партыяй. Вось чаму адной з галоўнейшых праблем унутрыпартыйнага жыцьця становіцца пытаньне аб максымальным абхваце марксыцка-ленінскім выхаваньнем партыйнай арганізацыі. Але і яе старыя кадры ня маюць права стаяць на месцы. Вучоба партыйнага актыву, тэарытычнае абагульваньне вяактыву, тэарытычнае і гаспадарчае вопыту партыі таксама становіцца адной з асноўных задач.

Разгортваючы выхаваньне і вучобу ў партыйнай арганізацыі, разьвіваючы самакрытыку, рэгулюючы сацыяльны склад арганізацыі, уцягваючы тысячы лепшых, найбольш адданых справе сацыялізму перадавікоў рабочай клясы і калгаснага сялянства, уладаючы ўсё больш тэхнікай, кіруючыся выпрабаванай і правільнай генэральнай лініяй, партыйная арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б) павядзе працоўныя масы Беларусі да яшчэ больших перамог.

***

Культурна-гаспадарчае будаўніцтва ў савецкім краі адбываецца на фоне культурнага і эканамічнага заціханьня ў краінах капіталізму. У нас адбываецца ўсё большае зближэньне — гаспадарчае і культурнае — паміж горадам і вёскай, у ворагаў — усё большы разрыў. У нас рост плянавасьці нашай гаспадаркі, у ворагаў — рост анархіі. У нас вялізарны над'ём вытворчых сіл, у ворагаў — штучнае задушэньне гэтых сіл. У нас масы праяўляюць вялізарную волю да будаўніцтва новага жыцьця, у краёх капіталізму — факты масавага самазабойства працоўных, якія ня бачаць ніякага прасьвету ў жыцьці. У нас масы вядуць упартае змаганьне за аўладаньне тэхнікай, у ворагаў пануе ідэалёгія тэхнічнага рэгрэсу; у нас вялізарнае імкненьне да ведаў, у ворагаў — аварот да веры, містыцызму; у нас ліквідуецца разрыў паміж разумовай і фізычнай працай, паміж практыкай і тэорыяй, у ворагаў тэорыя бясьсільна апладніць практыку, практыка супярэчыць усім тэорыям.

«Але лепшым спосабам альсьвяткаваць гадавіну вялікай рэвалюцыі, — указаў Ленін, — гэта скацэнтраваць увагу на нявырашаных задачах яе».

Пры нашых нізьмерных культурных, палітычных, арганізацыйна-гаспадарчых перамогах мы вельмі моцна адсталі тэхнічна, мы адсталі ад перадавых краін на 50-100 год, але мы ня можам выканаць плянаў вялікіх работ, ня можам пабудаваць сацыялізму, не аўладаўшы тэхнікай, «тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё» (Сталін).

Гэта задача аўладаць перадавой тэхнікай, прабегчы за 10 год адлегласьць, якая аддзяляе нас ад перадавых капіталістычных краёў, пастаўлена цяпер перад партыяй, рабочай клясай, перад народамі усяго Савецкага Саюзу. Калі мы гэтых задач ня выканаем, нас самнуць. Але «няма такіх крэпасьцей, якіх бальшавікі не маглі-б узяць». Мы вырашылі рад цяжкіх задач. Мы скінулі капіталізм. Мы ўзялі ўладу. Мы пабудавалі буйнейшую сацыялістычную індустрыю. Мы павярнулі серадняка на шлях сацыялізму. Самае важнае в пункту гледжаньня будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося ня многае: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. Калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх цяпер мы ня можам і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага напаўраўнаму». (Сталін).

Выкананьне гістарычных задач, што стаяць перад партыяй, магчыма толькі пры ўмове далейшай бязьлітаснай барацьбы на два фронты — супроць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх, барацьбы за генэральную лінію партыі.

*)

) Канец. Пачатак гл. у №№ 296 і 298.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Руйнуючы ўдар па апартуністах,

ЯКІЯ, САБАТУЮЧЫ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ, ЗРЫВАЮЦЬ ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ

Пастановай сакратарыяту ЦК КП(б)Б зьнят з работы дырэктар фабрыкі „Чырвоная зорка“ Уласенка, абвешчана суровая вымова і забаронена яму на працягу двух год займаць адказную кіруючую партыйна-гаспадарчую работу. Абвешчана суровая вымова і зьнят з работы сакратар парткалектыву Сяргун. Абвешчана вымова ўсяму складу бюро парткалектыву.

Перабудова партыйна-масавай работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі—асноўная ўмова вытворчых посьпехаў

Улічыць урокі

Ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі па перабудове партыйнай і масавай работы на вытворчасьці ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі зьяўляецца **першачарговай задачай кожнай партыйнай арганізацыі і кожнага камуніста ў паасобку.** Іменна перабудова партыйна-масавай работы забясьпечвае поўнае выкананьне і перавыкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну. Але, на жаль, бюро парткалектыву фабрыкі **«Чырвоная зорка»** (Чашніцкі р-н) на чале з сакратаром гэтага не зразумела. Яно не зразумела таго, што **«новыя ўмовы разьвіцьця прамысловасьці патрабуюць работы па-новаму»** (Сталін).

Партыйная работа перабудавана **фармальна,** у сувязі з чым цэхавыя ячэйкі не зьяўляюцца кіраўнікамі гаспадарчага будаўніцтва цоху. Партыйныя групы ў вытворчым цоху арганізаваны такім чынам, што яны не забясьпечваюць сваім кіраўніцтвам усіх працэсаў вытворчасьці. Адсюль, як вынік,—зусім слабая кіруючая роля камуністаў на вытворчасьці. **Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплен толькі 31 проц. камуністаў.** Ёсьць шмат выпадкаў рвацтва, прагулаў і спазьненьняў на работу. Самейнасьць і круговая парука ў партыйнай арганізацыі фабрыкі прывялі да зацікоу самакрытыкі. **На допісы рабкораў, якія зьмяшчаліся ў шматтыражцы «Чырвоная зорка», ні партыйны калектыў, ні дырэкцыя фабрыкі, ні фабком не рэагавалі,** ня гледзячы на тое, што ў гэтых допісах даваліся сыгналы аб прарывах у выкананьні прамфінпляну.

Чашніцкі райком партыі і раённая кантрольная камісія ніякіх мер па разгортаньні бальшавіцкай самакрытыкі на фабрыцы ня прымалі і на зацікі са макрытыкі не рэагавалі. ГЭТА НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ ЗЬЯВІШЧА З БОКУ РК І РКК КП(б)Б САКРАТАРЫЯТ ЦК КП(б)Б АСУДЗІЎ І ДАЎ КАТЭГАРЫЧНУЮ ДЫРЭКТЫВУ РАСЬСЬЛЕДАВАЦЬ УСЕ СПРАВЫ ЗАЦІСКУ САМАКРЫТЫКІ І ПРЫЦЯГНУЦЬ ВІНАВАТЫХ ДА ЖОРСТКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

Ганебныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну стварыліся таму, што трыкутнік фабрыкі палітычна збанкрутаваў, скаціўся на праваапартуністычныя пазыцыі і ігнараваў дырэктывы партыі аб перабудове партыйна-масавай работы, якая-б забясьпечвала выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну. Сьледам за дырэктарам тое-ж самае паўтараў і сакратар парткалектыву тав. **Сяргун. Праваапартуністычныя тэзэры Уласенкі і Сяргуна не знайшлі бальшавіцкага адпору і асуджэньне з боку партыйнага актыву. «ПАРТАКТЫЎ ФАБРЫКІ НА ЧАЛЕ З БЮРО КАЛЕКТЫВУ СТРАЦІЎ ПАЛІТЫЧНАЕ ЧУЦЬЦЁ, НЕ ЗМАГАЎСЯ ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ І ЗЬНІШЧЭНЬНЕ ХВАРАВІТЫХ ЗЬЯВІШЧ У ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І АСОБНЫХ КІРАЎНІКОЎ ФАБРЫКІ, АКАЗАЎСЯ Ў ХВАСЬЦЕ АДСТАЛЫХ НАСТРОЯЎ»,** (з пост. сакратарыяту ЦК КП(б)Б).

Ня гледзячы на тое, што фабрыка мае ўсе даныя для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў у выкананьні прамфінпляну працяга рашаючага году пяцігодкі, апартуністычнае кіраўніцтва прыяло не да глыбокіх прарываў. Прамфінплян за тры кварталы выкананы толькі на 60 проц., сабекошт прадукцыі вырос на 14,74 проц. замест зьніжэньня на 11,6 проц.

6 умоў тав. Сталіна ў жыцьцё не праведзены. Дырэктар фабрыкі Уласенка заявіў: «Умовы тав. Сталіна абгаворвалі, але на практыцы не ажыцьцяўляліся». І таму мы маем на фабрыцы такое становішча, калі гаспадарчы разрахунак, ні рабочы, ні інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, ні партыйная арганізацыя не мабілізаваны на выкананьне гэтай важнейшай задачы. Панае поўная ўраўнілаўка ў заработнай плаце. Работы па 3-м разрадзе атрымлівае 70 руб. 25 кап., а разрадзе атрымлівае 70 руб. 25 кап., а разрадзе атрымлівае 70 руб. 25 кап., а разрадзе (вядучая прафэсія) — 69 руб. 80 кап.; бягуначык па 3-м разрадзе атрымлівае 60 руб. 33 к., зарадчык па 4-м разрадзе—45 р. 53 к.; слесар другой рукі па 6-м разрадзе атрымлівае 126 руб. 42 кап., інструмалальшчык на 7 разрадзе—117 руб. 67 кап. **Такая ўраўнілаўка прывяла да масавай цякучасьці рабочай сілы: за тры кварталы ёмшла з фабрыкі 48 проц. рабочай сілы.** Ня гледзячы на гэта, кіраўніцтва ніякіх мер, каб у корані ліквідаваць ураўнілаўку і спыніць цякучасьць рабочай сілы, ня прымала.

Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена толькі 30 проц. усяго складу рабочых. Саюзагавор, які быў заключан з папяровай фабрыкай **«Спартак»,** ня выкананы. Фабком спаборніцтвам не кіраваў, а зьяўляўся толькі простым рэгістратарам тых норм, якія выпрацоўваліся. Гаспадарча-разрахунковых брыгад зусім няма.

Адзінаначальне на фабрыцы адсутнічае. Сямейнасьць, якая панае на фабрыцы, перашкаджае правядзеньню ў жыцьцё дырэктыў партыі аб адзінаначальні. Ёсьць шмат выпадкаў, калі майстар, каб не шкрыўдзіць «свайго чалавека», які нядбайна адносіцца да работы, парушае працоўную дысцыпліну, не рэагуе, а калі ніякага выхаду няма, ён павінен рэагаваць, дык імкнецца да таго, каб палажыў спагнаньне загатчык цэху, а ня ён, як кіраўнік шэфчага вытворчага вучастку.

На фабрыку за бягучы год прыбыла каля 50 проц. новых рабочых, многія з якіх прынесьлі з сабой дробна-буржуазную настрой. Ня гледзячы на гэта, выхаваўчая работа сярод іх зусім адсутнічае.

Бытавымі ўмовамі рабочых кіраўніцтва фабрыкі ня цікавіцца. Барак для кватэр новым рабочым будуецца на працягу году і ня скончан да гэтага часу, а між тым частцы рабочых прыходзіцца начаваць на фабрыцы (там, дзе працуюць), сьпіць на сталах і падлогах. Сталоўка працуе дрэнна, заусёды бруд.

Абмеркаваўшы становішча і работу фабрыкі «Чырвоная зорка», ЦК КП(б)Б жорстка ўдарыў па апартуністах, якія давялі фабрыку да такіх прарываў.

За праваапартуністычную практыку дырэктар фабрыкі Уласенка і сакратар партыйнага калектыву **вынятыя з працы з абвешчаньнем ім суровай вымовы,** зарычым Уласенку забаронена займаць адказную кіруючую партыйна-гаспадарчую пасаду на працягу 2-х год. Усяму складу бюро парткалектыву абвешчана вымова.

Прарывы на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» павінны паслужыць урокам для іншых прадпрыемстваў, якія не перабудавалі сваёй работы па-новаму, не мабілізавалі рабочых мас на барацьбу за выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну. Партыйны і рабочы калектывы фабрыкі «Чырвоная зорка» пры новым кіраўніцтве павінны па-бальшавіцку мабілізавацца на неадкладную рэалізацыю пастановы ЦК КП(б)Б, чым гарантуецца ліквідацыя дапушчаных на фабрыцы прарываў і пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы.

Старэйойтаў.

Аб становішчы і рабоце фаб. „Чырвоная Зорка“

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 1-га лістапада 1931 году

Заслухаўшы даклады дырэктара фабрыкі «Чырвоная Зорка»—тав. **Уласенка,** сакратара парткалектыву — тав. **Сяргуна** і судаклад інструктара ЦК КП(б)Б—тав. **Старавойтава,** сакратарыят ЦК КП(б)Б канстатуе сыстэматычнае невыкананьне прамфінпляну: за тры кварталы плян выкананы на 60 проц., прастоі павялічылі ся з 6,3% па пляне да 24,5%, сярэдні процант браку 6,9, замест 4,8 па пляне, рост прагулаў (за першы квартал 142, за другі квартал 738 і за трэці квартал 654), павышэньне сабекошту прадукцыі на 14,7 проц. замест зьніжэньня на 11,6 проц.

Гаспадарчы разрахунак у цэхах праведзен фармальна.

Ураўнілаўка ў зарплаце не ліквідавана (рабочы па трэцім разрадзе—70 руб. а сетачнік—вядучай прафэсіі 7-га разраду—69 руб.).

На вытворчасьці панае поўная абязьлічка. Рабочыя да машын і варштатаў не прымацаваны, не праведзена пашпартызацыя машын і варштатаў, пляны да кожнага рабочага не даведзены. Адсутнічае адзінаначальле. Маецца шмат выпадкаў невыкананьня рабочымі распаражэньня кіраўнікоў.

Гэтыя ганебныя прарывы тлумачацца тым, што трыкутнік фабрыкі праводзіў праваапартуністычную лінію і ня адолеў мабілізаваць рабочых на выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну, не перабудаваў партыйна-масавай, гаспадарчай і прафэсыянальнай работы, цэнтр цяжару партработы не перанесен у вытворчы вучастак (зьмены, брыгады), пасьць умоў тав. Сталіна не праводзіцца ў жыцьцё, сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты (сацспаборніцтвам ахоплена рабочых — 30 проц., камуністаў—31 проц., камсамольцаў—42 проц.), ніякай работы па пераводзе ўдарных брыгад на гаспадарчы разрахунак не вядзецца.

Партактыў фабрыкі на чале з бюро калектыву згубіў палітычнае чуцьцё, не змагаўся за ліквідацыю прарыву і зьніжэньне нездаровых зьявішчаў у партарганізацыі і асобных кіраўнікоў фабрыкі, аказаўся ў хвасьце адсталых настрояў.

Наяўнасьць сямейнасьці, нерэагаваньне на прапановы рабочых аб ліквідацыі недахопаў на вытворчасьці і адсутнасьць кіраўніцтва рабкораўскім рухам, прывялі да зацікоу самакрытыкі на фабрыцы.

Не атрымалі бальшавіцкага асуджэньня праваапартуністычныя разважаньні дырэктара фабрыкі—тав. Уласенка і сакратара парткалектыву — тав. Сяргуна аб тым, што фабрыка перажывае адпаўленьні пэрыяд і што прамфінплян зьяўляецца нерэальным.

На падставе гэтага сакратарыят ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. За сьвядомае ня прыняцьце мер па ліквідацыі недахопаў на вытворчасьці і за праваапартуністычнае кіраўніцтва фабрыкай дырэктара фабрыкі тав. Уласенка зьняць з работы, абвясьціць суровую вымову і забараніць на працягу двух год займаць адказную кіруючую партыйна-гаспадарчую работу.

Перадаць сьледчым органам справу аб злачынным скарыстаньні дарагога дэфіцытнага сырцу замест крэйды для напаўнцеля, што прыяло да вялікіх страт.

2. Зьняць з працы сакратара парткалектыву тав. Сяргуна за праваапартуністычную лінію ў рабоце і абвясьціць суровую вымову.

За праваапартуністычнае кіраўніцтва ўсяму складу бюро парткалектыву абвясьціць вымову.

3. Даручыць Аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б разам з паляровым аб'яднаньнем і ЦП саюзу ў 5-дзённы тэрмін вылучыць дырэктара фабрыкі і старшыню фабкома, арґінстру вылучыць таварыша для партработы на фабрыцы.

Для палепшэньня работы на фабрыцы сакратарыят ЦК КП(б)Б **прап

Пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) аб транспарце прапрацаваць у кожнай брыгадзе.

КАНТРОЛЬНЫ ПОСТ У ГОМЕЛЬСКІМ ДЭПО

правярае скарыстаньне паравознага парку

5.000 ЭКЗЭМПЛЯРАЎ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ НА БЕЛАРУСКАЙ І УКРАІНСКАЙ МОВАХ

Тэхнікум вузла пасылае студэнтаў і настаўнікаў у дапамогу цэхам.

ГОМЕЛЬ, 3. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШАГА СПЭЦКОРА). ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ГОМЕЛЬСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА РАЗГАРНУЛА ПРАПРАЦОЎКУ ПАСТАНОВЫ КАСТРЫЧНІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б) АБ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ. ТРЫКУТНІК ТАВА ЭКСПЛЕАТАЦЫЯНАГА РАЁНУ ЗАХ. ЧЫГ. 2 ЛІСТАПАДА РАЗАСЛАЎ ТЭЛЕГРАМЫ ЎСІМ ТРЫКУТНІКАМ РАЁНУ АБ НЕАДКЛАДНАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ-ЧЫГУНАЧНІКАЎ ВАКОЛ ПРАПРАЦОЎКІ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ. РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЛЕНУМУ АБ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ НАДРУКАВАНА Ў 3.000 ЭКЗЭМПЛЯРАХ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І 1.000 ЭКЗ. НА УКРАІНСКАЙ МОВЕ. ЗАЎТРА РЭЗАЛЮЦЫЯ БУДЗЕ РАЗАСЛАНА ЎСІМ ЧЫГУНАЧНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ РАЁНУ.

5 ЛІСТАПАДА СКЛІКАЮЦЦА ПАЗАЧАРГОВЫЯ ПАРТСХОДЫ ЎСІХ ЯЧЭЕК ДЛЯ АБМЕРКАВАНЬНЯ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ. У ДЭПО СЕНЬНЯ ЎВЕЧАРЫ ПРАВОДЗЯЦЦА ГУТАРКІ З НАЧНЫМІ ЗЬМЕНАМІ, А ЗАЎТРА БУДУЦЬ ПРАВЕДЗЕНЫ З РАНІШНІМІ ЗЬМЕНАМІ. ПАСЬЛЯ ПРАПРАЦОЎКІ НА СХОДАХ, ПЫТАНЬНЕ БУДЗЕ ПЕРАНЕСЕНА НА ВЫТВОРЧУЮ НАРАДУ ДЛЯ КАНКРЭТНАЙ РАСПРАЦОЎКІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ЛІНІІ РАБОТЫ ВУЗЛА.

КАЛЕКТЫЎ СЛУЖБЫ РУХУ 2-ГА ЛІСТАПАДА НА ТРЫКУТНІКАХ ЦЭХАЎ ПРАПРАЦАВАЎ РЭЗАЛЮЦЫЮ ПЛЕНУМУ І НАМЕЦІЎ РАД КАНКРЭТНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ.

ПРАВЕДЗЕНЫ АГУЛЬНЫЯ СХОДЫ СТРЭЛАЧНІКАЎ, КАНДУКТАРСКІХ БРЫГАД, ЗЬМЕННЫХ ПАЛІТШКОЛ. ТЭХНІКУМ УЗЯЎ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ДАПАМАГЧЫ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА ПРАПРАЦАВАЦЬ ПАСТАНОВУ ПЛЕНУМУ ШЛЯХАМ ВЫЛУЧЭНЬНЯ КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ, А ТАКСАМА ДАПАМАГЧЫ ЦЭХАВЫМ ГУРТКАМ ЗАВОДУ, ДЭПО І РУХУ. ПА ДЭПО АРГАНІЗОВАН КАНТРОЛЬНЫ ПОСТ ДЛЯ ПРАВЕРКІ СПАРАНАЙ ЯЗДЫ І СКАРЫСТАНЬНЯ ПАРАВОЗНАГА ПАРКУ.

Гафт.

Ня склад, а... дом адпачынку

Работа віцебскага вугальнага складу нікуды ня вартая. Няма належнай расстаноўкі сіл, адказнасьці за своячасовую пагрузку паравозаў. Шлях ад новых накапчарных ям, па якім павінен ісьці паравоз да дэпо, забіт вагонамі і крантамі, і паравоз прымушан падыходзіць праз взарнае дэпо. Качагарныя ямы загружаны шлакам, што перашкаджае праходу паравозаў.

Пад'ёмныя кранты абязьлічаны, рабочыя нават не прымацаваны да матораў. Крант № 31 больш за месяц не рамантуецца і працуе з вялікімі перабоямі. На пляцы валяецца вялікая колькасьць расківданых зьвоньняў рэек, вузкакалеек, якія заграмаджваюць склад. Пры кранце № 39 ня спраўны бадзьдзі.

Асьвятленьне пляцу вугальнага складу і пад'ёмных крантаў нездавальняючае. У кранце № 31 нямa ні адной лямпкі, у 32 і 59 — толькі па адной. У саміх крантах робіцца зчыстка домавых нарабак паравозаў і сьмецьце не прыбіраецца. Ваданапорныя калёнкі не асьвятляюцца.

З-за бескантрольнасьці на вугальным складзе паравозныя брыгады парушаюць правілы цёпла-тэхнікі. Паравозныя брыгады чысьцяць топкі пры ціску ў 11 і больш атмасфэр, замест устаноўленых 6 (паравоз 3-44 — ТАЦІКАЎ, Щ-3206— БАРАНОЎСКІ, Щ-5504 — КАРЭНЕЎ).

Машыніст ОВ-6646 БАРУШКА, выяжджаючы пасьля набору вугалю, пераразаў стрэлку і пакінуў яе ў такім становішчы, што трэбні не прылягалі да рэек. Гэта было заўважана толькі наступай брыгадай. Стрэлачніка паста № 5 на месцы не аказалася, ён спаў. Па яго віне паравоз С-37 быў затрыман на 4 мінуты.

Пад наборам вугалю паравозы прастойваюць значна больш вызначанай нормы ў 45 мінут. Напрыклад, паравоз Щ-747 прастаяў ГАДЗІНУ І 10 МІНУТ.

Паравозы падаюцца на склад несвячасова. Яны вельмі затрымліваюцца ў дарозе да вугальнага складу. Так, паравоз 747, прыбыўшы з цягнікам а 21 гадзіне, трапіў пад набор вугалю толькі а 1 гадз. 10 мін.

Таксама прастойваюць на складзе ў чаканьні выгрузкі вугалю вагоны. З пастаўленых у 3 гадз. 27 кастрычніка 18 вагонаў выгружана толькі палова. Рабочыя, якія выгружаюць вугаль у начны час, ня маюць лямп. У штабэлях вугалю адсутнічаюць таблічкі гатунковасьці. За працай рабочых ніхто ня сочыць. Ёсьць рабочыя, якія за 8 гадзін выгружаюць толькі 27 тон у той час, як іншыя — 40 тон.

Загадчык вугальнага складу Хмялеўскі не правярае работы начных зьмен, ня прымае захадаў да таго, каб палепшыць гаспадарчае кіраўніцтва.

А. ЗАРУБЕЖНЫ.

Рыхтавацца да баявога месячніка

З 10 лістапада па 10 сьнежня, ня менш 70% ільнавалакна павінна быць здана дзяржаве

АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПАСТАЯННЫХ БРЫГАД З КАНКРЭТНЫМІ ЗАДАНЬНЯМІ ДАБІЦЦА МАКСЫМАЛЬНАЙ ВЫПРАЦОЎКІ НА КОЖНЫМ МЯЛЬНА-СУШЫЛЬНЫМ ПУНКЦЕ

Шклоўшчына ўключылася ў месячнік

8 лістапада арганізуецца чырвоны ільняны абоз

ШКЛОЎ. (Па тэлеграфу). ПАСТАНОВАЙ РК КП(б)Б І РВК ШКЛОЎШЧЫНА ЎКЛЮЧЫЛАСЯ Ў МЕСЯЧНІК, АБВЕШЧАНЫ ЦК І СНК НА ХУТЧЭЙШУЮ АПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНАВАЛАКНА І ПЯНЫКІ ДЗЯРЖАВЕ. МАБІЛІЗАВАНЫ ЎСЕ ПАРТЫЙНЫЯ, САВЕЦКІЯ, ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫЯ І ЗАГАТОЎЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ДЛЯ ВЫРАШЭНЬНЯ ГЭТАЙ ЗАДАЧЫ.

8 ЛІСТАПАДА АРГАНІЗОЎВАЕМ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З ІЛЬНОМ. СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА САКРАТАРОЎ ПАРТ'ЯЧЭЕК, СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І КАЛГАСАЎ ПА ПЫТАНЬНІ ПРАВІДЗЕНЬНЯ МЕСЯЧНІКА.

Райком КП(б)Б БОЙКА.
РВК МІНЧОНАК.

Першы пераможца на фронце ільназагатовак

ШКЛОЎ.

Калгас «Прыют», Шклоўскага рабну, першы ў раёне выканаў і перавыканаў плян ільназагатовак, здаўшы ільнавалакна 11 цэнтн. замест 10 цэнтн. паводле пляну. Ільнянога семя здаў 11 тон замест 5 тон паводле пляну. Ільнасаломы і трасты здаў 188 цэнтнэраў замест 178 цэнтнэраў паводле пляну.

Калгас выканаў плян па зябліве і аказаў дапамогу ў капаньні бульбы другім калгасам раёну.

Калгас яднае 77 гаспадарак. Ён дабіўся гэтых посьпехаў, дзякуючы ўжываньню сацыялістычных мэтадаў у рабоце, правільнай расстаноўцы рабочай сілы і энэргіі старшыні калгасу т. Цэнгроўскага.

КАЗЛОЎ.

3,6 проц. гадавога пляну

БАБРУЙСК. (БЕЛТА).

На 25-га кастрычніка ўзьнята трасты па калгасным сэктары ўсяго 46 проц. да агульнай колькасьці ўбранага і абмалочанага, і па індывідуальным сэктары ўзьнята 90,6 проц., абмята трасты 11 проц. Справе першапачатковай апрацоўкі ільну і арганізацыі хутчэйшай апрацоўкі валакна, асабліва ў калгасах, да гэтага часу яшчэ не надана належнай увагі. Шырокая калгасная грамадзкасьць на ўдарную апрацоўку ільнавалакна не мабілізавана.

Гадавы раённы плян ільназагатовак выканан на 25-га кастрычніка ўсяго на 3,6 проц. Раённае гадавое заданьне па загатоўках ільнасемя — на 43,6 проц.

Ударныя тэмпы ў выкананьні пляну загатовак ільнасемя паказваюць Кавалеўскі сельсавет, які выканаў гадавое заданьне на 20-га кастрычніка па загатоўках ільнянога семя на 99 проц., Цялупскі сельсавет — 81 проц., Міхапоўскі — 80 проц. Ганебна адстаюць: Прадзьвінскі, Броскі, Падрэцкі, Бярэзьнеўскі і Казуліцкі сельсаветы, якія выканалі гадавое заданьне па ільнасемі ўсяго ад 10-19 проц. Райза і райкалгассаюз не забясьпечваюць цьвёрдага апэрацыйнага кіраўніцтва арганізацыяй хутчэйшай апрацоўкі ільнавалакна, а таксама здачы трасты льназаводу. Зусім мала цікавіцца гэтай справай аспоўны загатоўшчык ільнавалакна — райспажыўсаюз, які пакладаецца на самацёк.

Загатавіцеля не дачакаліся

ПОЛАЦАК. (НАШ КАР.).

Калгас «БАЛЬШАВІК» па дагаворацасьці з арганомам Ветрынскай МТС тав. Якубёнкам, 19 кастрычніка накіраваў чырвоны абоз у колькасьці 13 фурманак з 38 цэнтнэрамі ільнянога семя на станцыю Фарынава для здачы на загатоўчы пункт Ветрынскай МТС.

Але, ня гледзячы на дагаворнасьць, НА ПРЫЕМАЧНЫМ ПУНКЦЕ НЕ АКАЗАЛАСЯ ЗАГАДЧЫКА. КАЛГАСЬНІКАМ ПРЫШЛОСЯ ПРАСТАЯЦЬ УВЕСЬ ДЗЕНЬ ДА НОЧЫ НА ПУНКЦЕ, ЧАКАЮЧЫ ЗАГАТОЎШЧЫКА, АЛЕ ТАК І НЕ ДАЧАКАЛІСЯ. Калгасьніці ссыпалі ільняное семя без усякай вагі пад навець і пакінулі сваіх людзей чакаць загатоўшчыка да наступнага дня.

ВІНАВАТЫЯ Ў ГЭТЫМ АБУРАЮЧЫМ УЧЫНКУ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ, ЯК ЗА СЬВЯДОМЫ ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК СЕМЯ.

ШУСТРЫ.

Рашучы адпор кулацкім крыкуном

КАПЫЛЬ.

Старшыня Бабаўнянскага сельсавету Маргопін і старшыня гэтага-ж сельпо Роззінблюм увесь час заяўляюць, што пляны загатовак ільну не рэальныя. Гэтыя апартуністы нічога ня робяць для таго, каб выканаць пляны загатовак.

У выніку такіх адносін да перапрацоўкі ільну і загатовак на вачох у сельсавета і сельпо гніе 5 гэктараў ільну ў калгасе «Пуціловец». Лён яшчэ не абмалочам і не ачосан, ляжыць на дажджы і псуецца.

У калгасе «Шлях камуны» таксама не абмалочана 4 га ільну. Між тым, у гэтым калгасе стаіць машына па ачосе галовак, якую калгас не скарыстоўвае. Праўленьне калгасу працуе поўную бязьдзейнасьць, а сельсавет патурае гэтай бязьдзейнасьці.

Кіраўніцтвы сельсавету і сельпо такім чынам становяцца праваднікамі кулацкай лініі і вядуць работу на зрыў ільназагатовак.

Патрэбна нанесьці руйнуючы ўдар па кулацкіх агентах і крыкунох аб перавальнасьці пляну, якія сядзяць у Бабаўнянскім сельсавеце і сельпо.

Плян ільназагатовак павінен быць выкананы ў тэрмін.

Я.

Лістапад--рашаючы месяц загатовак ільнасемя

Галоўленком СССР разаслаў тэлеграму па сваёй сыстэме, якой абавязвае закончыць поўнае выкананьне пляну загатовак насеньня ільну і канапель у лістападзе месяцы.

Для гэтага прапануецца яшчэ больш шырока разгарнуць масавую работу сярод калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў—аднаасобнікаў. Арганізацыям садзеборніцтва і ўдарніцтва дабіцца арганізацыі нясупынных чырвоных абозаў з ільняным семям.

У мэтах заахвочваньня ўдарнай работы загатоўчага апарату, сельскіх упаўнаважаных, ударнікаў калгасу вызначана тры прэміі: першая—9.000 р. саюзам, якія закончаць выкананьне гадавога пляну загатовак да 15-га лістапада, другая—7.000 руб. за выкананьне пляну да 20-га лістапада, трэцяя—5000 р. за выкананьне пляну да 25-га лістапада.

Прэміі выдаюцца пры ўмове поўнага збору кантрактаванай прадукцыі, цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак, таксама поўнай адгрузкі насеньня не пазьней 1-га сьнежня маслабойнай прамысловасьці.

Пад знакам росту актыўнасьці рабочых мас

праходзіць справаздачна-перавыбарчая кампанія ФЗМК

Дзесяткі новых гаспадарча-разрахункових брыгад, сотні рацыяналізатарскіх прапаноў, тысячы заяў у партыю, камсамол, прафсаюз—так адказвае рабочая кляса на адозву УсеЦСПС.

Прадпрыемствы, якія плятуцца ў хвасьце, павінны ўзяць прыклад з лепшых—заводу імя Варашылава, „Камунара“ „Бальшавіка“

Прайшлі паўтары дэкады з дня звароту УсеЦСПС да ўсіх рабочых і работніц, прысьвечанага перавыбарам фабзаўкомам. За гэты час перавыбары ФЗМК па значнай колькасьці, у асаблівасьці буйнейшых, прадпрыемстваў разгарнуліся ў шырокую палітычную кампанію, якая ахапіла значную масу рабочых і выклікала новы ўздым вытворчага энтузіязму. Асноўныя задачы перавыбараў, якія пастаўлены ў адозьве УсеЦСПС, знайшлі па радзе прадпрыемстваў канкрэтнае праламленьне. У выніку — за перыяд з пачатку перавыбараў на гэтых прадпрыемствах мы маем базумоўныя посьпехі ў справе барацьбы за прамфінпляц, за ажыцьцяўленьне задач высунутых тав. Сталіным і адозвай УсеЦСПС.

На такіх прадпрыемствах, як завод «Камунар», «Бальшавік», імя Варашылава, фабрыка «Кастрычнік», наглядаецца рост гаспадарча - разрахункових брыгад. Як вынік новага ўздыму вытворчай актыўнасьці рабочых наглядаецца новы прыток рабочых прапаноў: па заводзе «Камунар»—звыш 300; па заводзе імя Варашылава—звыш 250; па фабрыцы «Кастрычнік»—50; па зав. «Бальшавік»—40; па заводзе «Дрэваапрацоўшчык»—40 і г. д. Як вынік адданасьці рабочай клясы генэральнай лініі партыі маем масавую падачу заяў у партыю. Наглядаецца такса ма значны рост камсамолу: па заводзе «Камунар» падана заяў у партыю 67, у ЛКСМ—40; па заводзе «Бальшавік» у партыю—20, па фабрыцы «8-е сакавіка» ў партыю — 6, у ЛКСМ—40; па заводзе імя Варашылава ў партыю — 25, камсамол—20; па пямцавай фабрыцы ў партыю—8, у ЛКСМ—12; па фабрыцы імя Крупскай у партыю — 6 і звыш 50 у ЛКСМ і г. д.

Па радзе прадпрыемстваў перавыбары былі скарыстаны для ўцягненьня неарганізаваных рабочых у прафсаюз. У гэтых адносінах ёсьць сур'ёзны зрух па такіх адставаўшых у частцы росту прафсаюзу прадпрыемствах, як ф-ка «8-е сакавіка», дзе зараз ўцягнута звыш 200 чалавек, фабрыка імя Крупскай—ўцягнута 100 чалавек, фабрыка «Камунарка»—ўцягнута звыш 300 чалавек. Узмацнілася барацьба па радзе прадпрыемстваў за прадсыцыпліну, з цякучасьцю, ілжэўдарніцтвам. Па радзе прадпрыемстваў наглядаецца рост прадукцыйнасьці працы. Па асобных прадпрыемствах праведзена значная работа па ахопе рабочых пазыкай—на фабрыцы імя Крупскай дадаткова падпісаліся на пазыку на 3.500 руб., па фабрыцы «8-е сакавікаа» — на 3.000 руб. і г. д.

Усё гэта сьведчыць аб вялізарным вытворчым уздыме, аб разгортваньні працы па мабілізацыі мас на выкананьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна і адозвы УсеЦСПС. Рад фабзаўмясцкомаў па-баявому ўключыліся ў правядзеньне перавыбараў. Па некаторых фабзаўмясцкомах вялікая праца праведзена па забесьпячэньні масавасьці. Значныя групы рабочых ўцягнуты ў самаправерачныя брыгады—па заводзе імя Варашылава—каля 400 чалавек, па заводзе «Камунар»—250; «Бальшавік»—звыш 200; «Камунарка»—звыш 300 і г. д.

Аднак, побач з гэтым ёсьць факты, якія сьведчаць аб праяўленьні недаацэнкі важнасьці перавыбараў, як палітычнай кампаніі. Гэта з усёй паўнатой адносіцца да такіх прадпрыемстваў, як сьпіртазавод, шпалерная фабрыка і інш. а таксама да раду рабачкомаў саўгасаў («Новы сьвет», «Чырвоны маяк», «Сяножаны»), дзе маса не мабілізавана на выкананьня адозвы УсеЦСПС, дзе нават і адозва яшчэ не прапрацавана. Гараддзяленьні працасьветы і капэрацыйных працаўнікоў таксама яшчэ цягнуцца ў хвасьце перавыбарчай кампаніі, не разгарнулі яшчэ працы па мабілізацыі мас на выкананьне задач, пастаўленых у адозьве УсеЦСПС.

Нельга не адзначыць імкненьня некаторых арганізацый скараціць тэрміны перавыбараў. Гэта адносіцца да гараддзяленьня каапработнікаў, некаторых рабачкомаў саўгасаў і асобных ФЗМК. Наглядаюцца спробы правесьці перавыбазы бяз шырокай самаправеркі работы ФЗМК і справаздачных сходаў (зав. «Чырвоная зара»). Некаторыя ФЗМК зусім упусьцілі ў самаправерачнай работе пытаньне прафсаюзных фінансаў: ліквідацыя запазычанасьці па членскіх узносах, праца са зборшчыкамі і г. г., у той час, калі на радзе прадпрыемстваў ёсьць значная запазычанасьць, зусім слаба працуюць рэвізійныя камісіі і зборшчыкі. Асабліва нездавальняюча ў гэтым напрамку стаіць справа на фабрыцы імя Крупскай і на заводзе «Чырвоны хэмік».

Асабліва трэба спыніцца на факце яўнага скрыўленьня дырэктыў УсеЦСПС і змазваньня палітычнай сутнасьці перавыбараў на сьпіртазаводзе. На гэтым заводзе рабочая маса ня была мабілізавана на выкананьне адозвы УсеЦСПС. Адозва зусім не прапрацоўвалася, самаправерка ня была разгорнута, ня было масавасьці, выбарчы сход, які быў ужо праведзен, прайшоў без належнай падрыхтоўкі, выбарчая камісія ня створана. Перавыбары ня былі скарыстаны для ўзмацненьня барацьбы за прадсыцыпліну, у выніку, калі ў жніўні ня было ніводнага прагулу, у верасьні іх было два, дык у кастрычніку—у часе перавыбараў — было 13 прагулаў. Зусім правільна пасунуў прэзыдыум Менскага гарпрафсавету, які скасаваў перавыбары, падкрэсьліўшы неабходнасьць правядзеньня іх у адпаведнасьці з указаньнямі і задачамі, пастаўленымі УсеЦСПС у сваёй адозьве. Факт, які меў месца на сьпіртазаводзе, павінен паслужыць урокам, як ня трэба праводзіць перавыбары.

На апошнім сваім пасяджэньні Менскі гарпрафсавет прапанаваў усім ФЗМК узмацніць працу па далейшым разгортваньні перавыбарчай кампаніі, па скарыстаньні новай хвалі вытворчай актыўнасьці работай масы, для поўнай і хутчэйшай рэалізацыі прамовы тав. Сталіна і адозвы УсеЦСПС. Прэзыдыум ГСПС знайшоў неабходным пэрсанальна папярэдзіць старшынь асобных ФЗМК і гар. аддзяленьняў, што нестаўраньне рашучага пералому на гэтых ФЗМК у справе перавыбараў, імкненьне скарачэньня тэрміну, парушэньне ўказаньняў УсеЦСПС — будуць разглядацца, як недаацэнка важнасьці перавыбараў, як праяўленьне апартунізму на практыцы. Нельга не адзначыць і таго, што да гэтага часу многія клюбы і чырвоныя куткі яшчэ ня ўключыліся ў правядзеньне перабыбараў, зусім слабы ўдзел прымаюць на некаторых прадпрыемствах насьцегазэты.

Усім прафарганізацыям трэба ўлічыць паказаныя вышэй недахопы і памылкі, каб на-ходу іх выправіць. Трэба даць рашучы адпор спробам змазаць палітычную сутнасьць перавыбараў. Трэба забясьпечыць правядзеньне перавыбараў, як масавай палітычнай кампаніі, над апакам ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна і адозвы УсеЦСПС.

Уп. Кудраеў.

Лепшы ўдарнік ст. Егарлык (Каўказ) стрэлачнік тав. Шапухін.

ДВА МЕСЯЦЫ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ

Загатоўкі насеньня і насеньнікаў фактычна не пачаты

Рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы загатовак насеньня. Неадкладна давесьці пляны загатовак да калгасаў і паселішч, даць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.

Пастанова НКЗБ і Наркамснабу БССР

аб становішчы і руху загатовак насеньня і забуртаваньні насеньнікаў

Канстатуе: 1. Да загатовак насеньня загатоўчымі арганізацыямі фактычна ня прыступлена і плян загатовак верасень—кастрычнік сарваны, аб чым сьведчаць наступныя лічбы:

Назва расьлін.	Проц. выкананьня гадавога пляну па становішчы на 21-X—1931 г. па сыстэмах.						Проц. выкананьня пляну верасень—кастрычнік па БССР.
	Дзярж. сэктар.	Белкалгаспасенсаюз.	Белхлебжывёлсаюз.	Белільнасаюз.	Садсаюз.	На БССР.	
Віка яравая	0	1	1	0	0	0,75	3,55
Сэрадэля	0	0,5	0	0	0	0,4	—
Канюшына	0	0,2	0	0	0	0,14	1,4
Цімафэўка	0	1,4	6,3	0	0	2	20
Лугав. травы	0	19	0	0	0	5,6	15
Лубін	0	0	0,2	0	0	0,06	—
Каранплоды:							
Буракі	0	1	0	0	0	—	—
Морква	0	0	0	—	—	0,5	2,4
Бручка	0	0	—	0	0	—	—
Турэпс	0	0	0	—	0	—	—
Агародныя:							
Капуста	0	0	0	0	0	—	—
Морква	0	0	0	0	0	—	—
Буракі	0	0	0	0	0	—	—
Цыкоры	0	0	—	—	—	0,6	3
Бручка	—	—	—	—	0	—	—
Цыбуля насен.	—	0	—	—	—	—	—
Гуркі	—	1	0	0	0	—	—
Інш. гародныя	0	1	0	0	0	—	—
Збожжавыя							
Авёс	0	5	—	—	—	1	—
Ячмень	0	19	—	—	—	6	—
Бабовыя	0	3	—	—	—	1	—
Жыта	91	91	—	—	—	91	—
Пшаніца	68	70	—	—	—	69	—
Віка азімая	42	—	—	—	—	42	—

2. Праца па забуртаваньні матачнага матар'ялу зусім не разгорнута, што выклікае пагрозу забесьпячэньня насенных плянтацый 1932 г. для мэт забесьпячэньня насеньнем 1933 г.

3. З боку беларускай канторы Саюзнасенводу праяўлена мягкацелясьць у адносінах да загатоўчых арганізацый, ня выкарыстаны шляхі рэгулявання ходу загатовак рублём, адсутнічае праверка ходу загатовак і забуртаваньня на мясцох, ня прыняты меры выкрыцьця і прыцягненьня да адказнасьці яўных зрыўшчыкаў загатоўкі насеньня і забуртаваньня.

4. З боку райснабаў і райсамадзеляў праяўлена поўная недаацэнка працы на загатоўках насеньня, пляны не даведзены да калгасаў і паселішчаў і нят даны цьвёрдыя заданьні кулацкім заможным дворам, раённыя пляны загатовак насеньня не распрацаваны, а даныя Наркамзему, Наркамснабу пляны палішты да спраў. (Менск, Парычы і інш.) адсутнічае праверка дзейнасьці нізавых, загатоўчых арганізацый, ня прыняты меры да ўмацаваньня насенных баз Белкалгаспасенсаюзу (Бешанковічы, Расоны, Тураў, Горкі).

5. З боку Белсельтрэсту, Белнасентрэсту, Белкалгаспасенсаюзу, Белхлебжывёлсаюзу, Белсадсаюзу, Белільнасаюзу, Белкалгаспэнтру ня прыняты меры на выкананьні пастаноў Наркамзямляробства, Наркамснабу і ўраду на разгортваньні працы на загатоўках насеньня, вылучэньні асобных працаўнікоў па гатуковым абмене і мабілізацыі насеньня, умацаваньні кадрамі, заключэньні адпаведных дагавораў (Белкалгаспасенсаюз), вылучэньні інструктарска-кантрольнага апарату па сыстэматычным нагляджэ і інструктажы работы па загатоўках насеньня ў раёнах, увядзеньні пастаянных справаздачных вестак па загатоўках і абмалоце насеньня.

Выходзячы з маказанага Наркамснаб і Наркамзем пастанаўляюць:

1. Ускласьці на тав. Мартэнсона па Наркамземе і т. Красоўскага па Наркамснабе пастаянны нагляд і праверку за ходам насеннязагатовак і буртаваньня насеньнікаў, даручыўшы апошнім кожную дэкаду заслухоўваць: даклады загатоўчых і вытворчых арганізацый па загатоўцы насеньня і забуртаваньня насеньнікаў.

2. Пэрсанальную адказнасьць за ход абмалоту, ачыстку, дакумэнтацыю здачы і захаваньне насеннай прадукцыі, забуртаваньне матачнікаў і ўлік насенных рэсурсаў ускласьці ў раёнах на загадчыкаў райза, старшынь райкалгассаюзаў, упаўнаважаных насенкантор, дырэктароў МТС і саўгасаў, а ў цэнтры на Белканторы Саюзнасенводу па т. Еўдакімава, Белнасентрэсьце—Энгельгарда, Белсельтрэсьце—Самохіна, Сьвінаводзе—Стрыго, Белкаапсаўгасабяднаньні—Вайцэховіча, Саюзпрамкорме—Федаровіча, Белкалгаспэнтру—Залескага, Трактарацэнтру—Обуха, Белкалгаспасенсаюзе—Ратайко, Белсадсаюзе—Пазарова, Белільнасаюзе—Чайка, Белхлебжывёлсаюзе—Іванова.

3. Абавязаць сэктар вучоту Наркамзямляробства разам з Белканторай Саюзнасенводу ўстанавіць дэкадную раённую тэлеграфную праверачную справаздачнасьць аб ходзе абмалоту, загатовак насеньня, забуртаваньня і ўмацаваньня насенных кантор Белкалгаспасенсаюзу, а таксама сумесна з Белкалгасцэнтрам рас працаваць і безадкладна ўвесьці падрабязны ўлік збору страхавых і насенных фондаў.

4. Абавязаць загатоўчыя арганізацыі па працягу 5-ці дзён дабіцца сапраўднага пералому ў загатоўках насеньня і забуртаваньні матачнікаў. Даручыць тав. Мартэнсону і тав. Красоўскаму ў выпадку невыканаьня прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

5. Абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем за неарганізацыю і яўную недаацэнку насеннязагатоўчай працы і мабілізацыі насенных рэсурсаў наступным загадчыкам райза і райснабу: Пэрычы, Расоны, Брагін, Бешанковічы, Тураў, Койданава, Менск (заг. гарза).

6. Папярэдзіць усіх загадчыкаў райза, райснабаддзелаў, старшынь райкалгассаюзаў, упаўнаважаных насенбаз, дырэктароў МТС і саўгасаў, старшынь райкаапсаюзаў і кіраўніцтва калгасаў аб неабходнасьці безадкладнага зьнішчэньня недаацэнкі справы мабілізацыі насенных рэсурсаў, узмацненьня працы па абмалоце і здачы дзяржаве насеньня, і што бязьдзейнасьць у гэтым напрамку мяжуе са шкоднай дзейнасьцю і што вінаватыя будуць прыцягнуты да суровай судовай адказнасьці.

7. За непрадстаўленьне капчатковых плянаў загатовак насеньня дзяржнасенфонду, нядачу канкрэтных заданьняў саўгасам па здачы насеньня і за недаацэнчальнае зьнижэньне пляну загатовак, прынятага ўрадам, паставіць на від дырэктару Белнасентрэсту Каралёву, Белсельтрэсту—Самохіну і пам. старшыні Белкалгаспасенсаюзу Ратайка, обавязаўшы Белсаўгастрэст, Белнасентрэст і Белкалгаспасенсаюз безадкладна выканаць даны 16-га жніўня плян Белканторай Саюзнасенводу на збожжавых расьлінах у вызначаныя тэрміны.

8. Абавязаць старшыню Хлебжывёлсаюзу т. Журомскага накласьці адміністрацыйнае спагнаньне на прадаўнікоў сваёй сыстэмы за неразгортваньне працы па загатоўках насеньня, і аб надажэньні спагнаньня далажыць у 2-дзённы тэрмін Наркамзему і Наркамснабу.

Старшыні Ільнакапаплеводсаюзу і Садсаюзу паставіць на від за поўную неарганізаванасьць і адсутнасьць працы па загатоўках насеньня.

9. Даручыць працаўніком Наркамснабу, якія выехалі ў раёны, правесьці работу па ўзмацненьні загатовак насеньня побач з працай па загатоўках збожжа і бульбы.

10. Абавязаць Белкантору Саюзнасенводу на працягу сьнежань—лістапад правесьці на мясцох праверку дзейнасьці загатоўчых і насеннаводчых арганізацый, арганізаваўшы ў далейшым сталы кантроль гэтых мерапрыемстваў.

Адначасова даручыць цэнтральнай кантрольнай насеннай станцыі, пад асабістую адказнасьць т. Сяргеенкі, у 5-цідзённы тэрмін закончыць выдачу выпікаў апрабацыі і ўжыць па ўсёй сетцы кантрольнай станцыі мерапрыемствы кантролю за гаспад. арганізацыямі ў адносінах якасьці і дакумэнтацыі насеньня.

За несвячасовае выкананьне апрабацыі і выдачу выпікаў абвясьціць тав. Сяргеенкі вымову.

Наркамзямляробства РАЧЫЦКІ
Наркамснаб БАЛЦІН.

Насеньне павезьлі назад

КАПЫЛЬ. (Наш кар.).

У раёне вылучаны 22 калгасы, якія спэцыялізуюцца ў разьвядзеньні гатуковага насеньня. Тут-жа ёсьць спэцыяльны ўпаўнаважаны насеннаводсаюзу, які павінен займацца загатоўкай гэтага насеньня.

Аднак, гэты ўпаўнаважаны (тав. Кулеш) нічога ня робіць у напрамку разгортваньня загатовак насеньня. Некаторыя калгасы самі прывозілі насеньне, але ніхто яго ня прыняў і яны вымушаны былі везьці назад. Тав. Кулеш спасылаецца на тое, што быццам няма складаў для загатоўкі.

На самой справе склады ёсьць у мястэчку Грозаве і Пясочным. Упаўнаважаны-ж хоча загатаўляць насеньне абавязкова ў Капылі, што зусім няматэвагодна, бо Грозава і Пясочнае бліжэй да чыгункі.

Трэба рашуча ўдарыць па бязьдзейнасьці і галавацяпству ўпаўнаважанага і разгарнуць загатоўкі насеньня.

Б. Х.

„А для чаго-ж у нас ільназавод?“

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). Становішча першапачатковай апрацоўкі ільну ў Вушацкім раёне самае небясьпечнае.

Калі дырэктару МТС тав. БАРАНАВУ і старшыні праўленьня райкалгассаюзу тав. ЗАМЯДЗЯНСКАМУ было паставлена пытаньне, як стаіць справа з далейшай апрацоўкай ільну і чаму для гэтага ў калгасах ня створаны спэцыяльныя брыгады, дык яны адказалі: «Ніякіх брыгад мы не стварэлі і стварэць ня будзем. Яны ўжо нам непатрэбны».

— Чаму не патрэбны? А пастанова Калгасцэнтру?

— Што нам да пастановы,—сьмяецца дырэктар МТС БАРАНАЎ,—а для чаго-ж у нас ільназавод? Што мы для таго будуем яго, каб ён іржавеў ці што?

Шкоднасьць такой думкі відавочная. Паводле распараджэньня гэтых апартуністаў усе калгасы ільнатрасту вязуць на ільназавод, там складаюць яе ў стагі, якія нават і сапомай не закрываюць, НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ АД ДАЖДЖУ.

Год выданьня—XV
№ 302 (4298)
Чацьвер, 5 лістапада
Цана нумара 6 кап.

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА МЕНСК, СЯВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны: рэдактар—4-27,)—сакратар—16-74, партсэктар—13-60, прамысл.—13-80, сял. земл.—6-19, нясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—9-42, нішта родная інфармацыя—10-74, кантора выдавецтва—7-81, кадры, абвестак—7-81.

Байкі аб чырвонай небясьпецы—

новая аргумантацыя Японіі для пашырэньня акупацыі Манчжурыі

Паклёпніцкімі вымысламі на СССР імпэрыялістам ня ўдасца апраўдаць грабежніцтва Кітаю

Хто сее вецер, той пажне навальніцу

Рада Лігі Нацый прыняла, як вядома, рэзалюцыю, якая абавязвае Японію вывесьці войска з паўднёвай Манчжурыі да 16 лістапада. Японскі дэлегат галасаваў супроць гэтай рэзалюцыі, а з тае прычыны, што для абавязковых пастаноў рады Лігі Нацый необходна, каб яны былі прыняты аднагалосна, дык гэта пастанова ня мае абавязковага характару. Але яна ўсё-ж зьяўляецца палітычным фактам, які ў пэўнай меры стварае для японскай ваеншчыны нявыгоднае становішча. Аднак, няма такога становішча, з якога імпэрыялісты не маглі-б знайсьці адпаведнага «выхаду». Акупацыю паўднёвай Манчжурыі японская ваеншчына тлумачыла небясьпекай, якая пагражае японскім рэзыдэнтам і японскай уласнасьці з боку розных часьцей разброенай арміі Чжан Сюэляна, з боку салдат, стаўных бандытамі і г. д. Гэта аргумантацыя была прызначана для апраўданьня акупацыі. Але такая аргумантацыя становіцца яўна невыстарчальнай нават у Лізе Нацый. Патрэбны новыя аргументы для вытлумачэньня далейшага пакіданьня акупацыйных войск у Манчжурыі. І калі няма ў прыродзе такога аргументу, трэба яго скласьці, выдумаць.

І вось выдумляецца байка аб чырвонай небясьпецы ў Манчжурыі, байка аб умяшаньні СССР у кітайска-японскі канфлікт. Ня гледзячы на яўную хлусьню гэтых чутак, выдуманых пэўнымі коламі, што дзейнічаюць на тэрыторыі Манчжурыі, яны выклікалі шырокія водгукі і капіталістычных колаў і капіталістычнага друку ня толькі Японіі, але і ўсяго сьвету. Якім мэтам служаць падобныя выдумкі, растлумачвае нью-ёркская газэта «Уорлд тэлеграф». Рэдактар фінансавага аддзелу газэты піша: «Вайна, магчыма, нават стымулюе гандаль. Калі Расія будзе ўцягнута ў яе нават у малой ступені, дык яна будзе прымушана адмовіцца ад пяцігодкі, якая прад'явіла больш клопатаў Злучаным Штатам».

Амэрыканская газэта ўжо загадзя падлічвае, з аднаго боку, прыбыткі ад ваенных паставак Японіі і Кітаю, а з другога боку марыць аб краху пяцігодкі, выкліканым тым, што Савецкаму Саюзу прыдзецца расстрэльваць у паветра сталь і жалеза, якія ў адваротным выпадку пашлі-б на будаўніцтва заводаў. Рэакцыйная французкая газэта «Лібэртэ» ўжо бачыць пачатак інтэрвэнцыі супроць СССР, якая народзіцца з барацьбы за падзел Кітаю. Яна піша: «Кітай зусім не краіна, а кантынэнт, у якім Японія ў стане ўстанавіць парадак і здольна ў якасьці салдата цывілізацыі зруйнаваць дзяржаву, найбольш слабую з боку Сібіры. Калі Эўропа зразумее свой абавязак перад цывілізацыяй, то сусьветныя рынкі могуць скора стаць полем бойкі, на якім загіне бальшавізм».

Мы бачым, як імпэрыялістычныя колы раду дзяржаў з гатоўнасьцю ўцупрылі і распаўсюджваюць байку аб чырвонай небясьпецы ў паўночнай Манчжурыі. Вядома, гэтыя панове дасканала разумеюць усю недарэчнасьць чутак аб савецкім умяшаньні. Але што-ж рабіць, калі без такіх чутак няма магчымасьці «апраўдаць» ваенную акупацыю. Японская ваеншчына падрыхтоўвае пашырэньне ваеннай акупацыі Манчжурыі, спадзяючыся, што ўдасца аслабіць супрацьлеглые іншых імпэрыялістычных дзяржаў перэпэктывай канфлікту в СССР, так пажаданага пэўным імпэрыялістычным колам у Эўропе.

Ня выключана і нават магчыма, што мы маем тут нейкую эмову. Становішча зусім яснае. Замест аднячэньня Манчжурыі ад японскіх войск, японская ваеншчына падрыхтоўвае пашырэньне акупацыі на поўнач Манчжурыі. Да гэтага часу акупацыю прабавалі «апраўдаць» назяўнасьцю кітайскіх «бандытаў». Але аргумант аб бандытызьме нікога ўжо не пераконвае. Патрэбен новы аргумант, які можа паслужыць ye карысьць акупантам хаця-б да 16 лістапада, калі Ліга Нацый павінна будзе зьвярнуцца да пытаньня аб японска-кітайскім канфлікце. Такім аргумантам лічаць акупанты байку аб савецкім умяшаньні, паклёпніцкія вымыслы аб скандэнтраваньні савецкіх войск ля межаў Манчжурыі, аб снабжэньні кітайскіх войск з СССР, аб савецкіх ваенных інструктарох і г. д.

Што-ж, няхай працуюць панове заходнія і ўсходнія падпальшчыкі войнаў і канфліктаў, выдумваючы недарэчныя чуткі аб СССР на дабро імпэрыялістам усіх краёў. Калі яны яшчэ ня ведаюць, дык яны даведаюцца ў свой час, што хто сее вецер, той пажне навальніцу.

«Известия».

Выступленьне т. Сакольніка ў падкамісіі эўрапэйскай камісіі

„Хваробы і ганьбы капіталістычнага рэжыму нельга вылечыць“

ЖЭНЭВА, 3. На пасяджэньні спэцыяльнай падкамісіі эўрапэйскай камісіі па вывучэньні савецкага праекту пакту аб эканамічным ненападзе, савецкі дэлегат т. Сакольнікаў у сваёй прамове сказаў:

«Савецкая дэлегацыя ўнесла праект пакту аб эканамічным ненападзе, коратка фармулёўшы прынцыпы недапушчальнасьці дыскрымінаваньня адных краін другімі ў эканамічнай галіне. З пункту погляду міжнароднага эканамічнага становішча прадстаўлялася здавалася-б, зусім мэтазгодным хутчэйшае абмеркаваньне і прыняцьце савецкага праекту пакту. Пакт да гэтага часу ня быў разгледжан па сутнасьці.

Абараняючы цяпер на даным камітэце неабходнасьць дасканалага, шпаркага і актыўнага абмеркаваньня савецкага праекту пакту аб эканамічным ненападзе, **савецкая дэлегацыя не выступае ў ролі доктара, які хоча вылечыць капіталістычны рэжым ад яго хвароб. Мы ўпэўнены, што хваробы і ганьбы гэтага рэжыму нельга вылечыць і што толькі замена капіталістычнай анархіі сыстэмай сацыялістычнай плянавай гаспадаркі здольна забясьпечыць шпаркае і магутнае разьвіцьцё прадукцыйных сіл, якія мае чалавецтва.**

Эканамічная палітыка савецкага ўраду не накіравана да таго, каб, як цьвер заяць пісатэлі антысавецкія публіцысты, імкнуцца ўносіць найбольшы непарадак у сусьветную гаспадарку. Савецкая эканамічная палітыка аберагала шпаркі падём савецкай гаспадаркі ад шкодных уплываў, якія маглі-б прасякаць са сфэры, ахопленай бязьлітасным, крызісам капіталістычнай гаспадаркі.

Уносячы праект пакту аб эканамічным ненападзе ў момант разгару сусьветнага эканамічнага крызісу, савецкі ўрад дзейнічаў у адпаведнасьці з прынцыпамі мірнага існаваньня дзьвёх розных эканамічных сыстэм, абвешчаных тут на міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі ў 1927 годзе».

Паказваючы далей на тое, што пакт аб эканамічным ненападзе мае значэньне з пункту погляду ня толькі інтарэсаў СССР, але і краін капіталізму, тав. Сакольнікаў гаворыць далей:

«Зусім бясспрэчна, што СССР найбольш рэальна адчувае на сабе вынікі эканамічнай агрэсіі, наколькі ў радзе краін прымаюцца эканамічныя меры. прыемствы, непасрэдна накіраваныя да дыскрымінацыі СССР. Мерапрыемствы, накіраваныя спэцыяльна супроць СССР у радзе эўрапэйскіх краін, а імянна ў Бэльгіі, Югаславіі, Румыніі і Вэнгрыі, да гэтага часу не скасаваны. Таксама не скасаваны накіраваныя супроць СССР спэцыяльныя меры, устаноўленыя ў заакіянскіх краінах. У апошні час у адной з заакіянскіх краін адкрыта варожа выступілі супроць гандлю з СССР, што прывяло да спыненьня гандлёвых адносін паміж СССР і гэтай краінай.

Напады супроць СССР ня спыняюцца. У даны момант мы вымушаны канстатаваць новую хлусьлівую кампанію супроць СССР, якая апэрує выдумкамі аб надыходзячай нібы некрэдытаздольнасьці СССР. З прычыны таго, што рад капіталістычных краін аказаліся некрэдытаздольнымі, то гэта зьяўляецца, відавочна, выстарчальнай падставай для таго, каб папярэдзіць чуткі, што некрэдытаздольнай аказацца і краіна сацыялістычнай гаспадаркі. Сыстэма плянаваньня народнай гаспадаркі, якая ўключае таксама цьвёрдае плянаваньне валютных разрахункаў, зьяўляецца лепшай гарантыяй супроць магчымасьцяй надыходу некрэдытаздольнасьці. Усім відомы той факт, што пры агульным зьніжэньні гандлёвых зваротаў толькі заказы СССР бязупынна растуць».

Пасьля прамовы тав. Сакольнікава адкрываецца агульная дыскусія.

Новае зьвяно ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР

Пілсудзкі—камандуючы аб'яднанай польска-румынскай арміяй

ВАРШАВА, 3. «Ілюстраваны кур'ер цодзенны» (выходзіць у Кракаве), зьмяшчае сэнсацыйную «тэлеграму» варшаўскага карэспандэнта «Чыкага трыбюн», у якой гаворыцца: «З блізкіх да маршала Пілсудзкага колаў карэспандэнт даведаўся, што ў часе апошняга патаемнага наведваньня маршалам Румыніі былі закончаны перагаворы, якія раней вяліся прадстаўнікамі румынскага генштабу і братам румынскага караля Мікалаем у Варшаве. Польская і румынская армії, якія складаюць разам 700.000 чалавек, у выпадку вайны будуць знаходзіцца пад агульным камандваньнем маршала Пілсудзкага, які будзе назначан маршалам польскім і румынскім». Карэспандэнт «Чыкага трыбюн» дадае, што наведамленьні аб падобным рашэньні выклікалі здавальненьне ў ваенных колах, бо «асоба маршала Пілсудзкага дае гарантыю належнай баявой вывучкі дзьвёх аб'яднаных найбольш буйных армій усходняй Эўропы».

Адначасова «Кур'ер цодзенны» зьмяшчае паведамленьне з Варшавы, у якім абвяргаецца паведамленьне аб назначэньні маршала Пілсудзкага генэралісімусам польскай і румынскай армій і ўказваецца, што акрамя нядаўна адноўленых польска-румынскіх згод ніякіх новых дагавароў заключана ня было.

Узмацненьне забастовачнага руху ў Польшчы

ВАРШАВА, 3. Друк паведамляе аб узмацненьні забастовачнага руху ў Польшчы. Забастоўка па шаўковай прамысловасьці ня спыняецца. Выбухнула таксама забастоўка ў радзе панчошных прадпрыемстваў. На гэтым тыдні павінна пачацца ўсеагульная забастоўка лодзінскіх пекараў, частка якіх ужо бастуе. у рэзультаце чаго ў Лодзі адчуваецца недахват хлеба. Повадам да забастоўкі зьяўляецца спроба прадпрыемцаў зьнізіць зарплату на 45 проц.

Прысуд па справе ППС—лявіцы ў Лодзі

ВАРШАВА, 3. Акруговы суд у ЛОДЗІ вынес прыгавар па справе рабочых членаў ППС-лявіцы, абвінавачаных у падрыхтоўцы забастоўкі. 4 АБВІНАВАЧАНЫХ ПРЫГАВОРАНЫ ДА 4 ГОД, 11 ЧАЛ.—ДА 2 ГОД КАТАРЖНАЙ ТУРМЫ.

11 рэвалюцыйных гарнякоў пасаджаны ў турму

НЬЮ-ЁРК, 3. У Заходняй Пэнсільваніі 11 рэвалюцыйных гарнякоў прыгавораны судом да турэмнага зьняволеньня на тэрмін ад 6 месяцаў да 2 год. Падсудныя абвінавачваліся ў падбухторваньні да сутычкі, якая адбылася ў часе **забастоўкі гарнякоў** у чэрвені 1931 году паміж забастоўшчыкамі і прыхільнікамі амэрыканскай федэрацыі працы, якія прабавалі сарваць забастоўку.

Перад 14-ай гадавінай Кастрычніка

„Посьпехі 3-га рашаючага—маяк на нашым шляху“

Рабочым фабрык і калгасьнікам Менскага раёну

У сувязі з XIV гадавінай Кастрычніцкай рэвалюцыі, мы шлем вам сваё пралетарскае прывітаньне. Мы ўспамінаем нашы ўражаньні ў часе знаходжаньня летам гэтага году ў вашым раёне.

Вялізарнейшыя посьпехі трэцяга рашаючага году пяцігодкі зьяўляюцца для нас маяком на шляху да перамогі і зьвяржэньня капіталізму.

Вашы посьпехі выклікаюць нянавісьць імпэрыялістаў усіх краін і спачуваньне ўсёй сусьветнай рабочай клясы. У нас, у Чэха-Славакіі ўсё павялічваюцца рады беспрацоўных, у той час, як у вас не хапае тысяч рабочых. Нашы рабочыя ўсё ясьней разумеюць, што толькі ваш шлях правільны і гатовы абараніць СССР, у выпадку нападу імпэрыялістаў.

Чэха-Славацкія сацыял-фашысты—самыя заядлыя ворагі СССР — у апошні час пічаць патрэбным, побач з апляваньнем СССР, праводзіць «левыя» манэўры ў адносінах да вашай краіны, прабуючы ўжываць рабочых сваімі двудушнымі фразамі. Яны хочуць выкарыстаць хоць часова СССР у якасьці рынку для збыту пішніх тавараў, яны манэўруюць таксама для таго, каб утрымаць свае пазыцыі сярод рабочых мас. Нават сярод рабочых, арганізаваных у с.-д. партыю і прафсаюзы, якія знаходзяцца яшчэ пад уплывам сацыял-фашысцкіх праваздыроў, расьце цяга да СССР.

Стойце стойка на сваім пасту, павышайце тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва! Сваімі дасягненьнямі вы дапаможаце сваім братом па клясе перамагчы буржуазію!

ЧЭХА-СЛАВАЦКАЯ РАБОЧАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ.

Працоўныя Бабруйшчыны рыхтуюцца да сьвята

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Стандартны цэх **дрэваапрацоўчага камбінату** даваў выпуск дамоў з 19,2 у першай пяцідзеўцы кастрычніка, да 24,86 дома ў пятай пяцідзеўцы. Лік ударнікаў узрос на 72 чал. Брыгада цесьляроў абвясьціла сябе ўдарнай.

Беларэўны цэх камбінату перавёў усе брыгады на гаспадарчы разрахунак.

Міхалеўскі сельсавет абавязаўся да сьвята перавыканаць плян збожжазагатовак на 15 проц., квартальны плян мабілізацыі сродкаў на абавязковых плацяжох на 100 проц., а па добраахвотных — на 50 проц., закончыць будаўніцтва дарог. Такія абавязацельствы прымаюцца і па іншых сельсаветах. Калгас «Пралетары» ўзяў на сябе абавязацельства да 7-га лістапада скончыць пабудову скотнага двара, перавесьці фэрму на гаспадарчы разрахунак.

5-6 лістапада

Крамы і сталоўкі працуюць бесьперапынна

УСІМ ГАРСНАБАМ І ГАРІНСП КЦЫЯМ ПРАЦЫ

У МЭТАХ НАЙЛЕПШАГА АБС. УГОЎВАНЬНЯ РАБОЧАГА-СПАЖЫЎЦА, ПАПЯРЭДЖАНЬНЯ ЧАРГІ Ў КР МАХ, НАРКАМПРАЦЫ І НАРКАМСНАВ ПРАПАНУЮЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННУЮ ПРАЦУ УСІХ КРАМ, СТАЛОВАК, ЛАРКОЎ У ПЕРАДСЬВЯТОЧНЫЯ ДНІ 5, 6 ЛІСТАПАДА.

ВЫХАДНЫЯ ДНІ, ЯКІЯ ПРЫПАДАЮЦЬ НА ПЕРАДСЬВЯТОЧНЫЯ ДНІ, ЯК ДЛЯ КРАМ У ЦЭЛЫМ, ТАК І АСОБНЫХ РАБОТНІКАЎ УСІХ КРАМ КАМПЭНСУЮЦЦА ІНШЫМІ ДНЯМІ НА ПРАЦЯГУ БЛІЖЭЙШАЙ ПАСЬЛЯ СЬВЯТА ДЭКАДЫ.

НАРКАМПРАЦЫ **БАСКІН.** НАРКАМСНАВ **БАЛЦІН.**

У падарунак Кастрычніку

Рабочыя Магілеўскага дэпо адзначаюць 14-ю гадавіну Кастрычніка перавыкананьнем сваіх плянаў. Звыш пляну будуць выпушчаны адзін паравоз з абточкі, 6 паравозаў з пэрыядычнага рамонту і 6 вагонаў.

Ужо адрамантаваны два цягнікі пэрыядычнага рамонту ў падарунак новаму НКШЗ тав. АНДРЭЕВУ.

Новыя рабочыя сталоўкі

У ДНІ КАСТРЫЧНІЦКІХ СЬВЯТ АДКРЫВАЮЦЦА НОВЫЯ РАБОЧЫЯ СТАЛОЎКІ НА ЗАВОДЗЕ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» (ВОРША), НА ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» (МЕНСК), НА ЦАГЕЛЬНІ № 9 (ВОРША) І НА ФАБРЫЦЫ «ДЗЬВІНА» (ВІЦЕБСК). ПАЧНЕ ПРАЦАВАЦЬ КЛЮБ-СТАЛОЎКА НА ЦАГЕЛЬНІ № 7 (МАГІЛЕЎ).

Тав. Сьмілга—намесьнік старшыні дзяржпляну СССР

МАСКВА, 3. Саюзны Саўнарком назначыў тав. Сьмілгу намесьнікам старшыні Дзяржпляну СССР, вызваліўшы яго ад абавязкаў члена прэзыдыума ВСНГ СССР.

Палац кнігі—дзяржаўная бібліятэка

8-га лістапада г. г. адбудзецца ўрачыстае адчыненьне новага будынку дзяржаўнай бібліятэкі. Да адкрыцьця ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка. Новы будынак прадстаўляе сабой шкляна-бетонны палац, заліты сьвятлом.

Тэхнічны аддзел займае адно з галоўнейшых месц будынку. Для яго адведзена памяшканьне пярэдняга фасаду, ашклёнае з усіх бакоў. Гэты аддзел будзе абслугоўваць навуковых работнікаў, вынаходцаў-рабочых, студэнтаў, якія вывучаюць і штурмуюць вышыні тэхнікі. Аддзел наладжвае кансультацыю і будзе даваць адказы і тлумачэньні па ўсіх пытаньнях сучаснай тэхнікі.

Уздоўж вялізнага і сьветлага калідору ідуць дзьверы іншых габінетаў. Савецкі аддзел будзе зьмяшчаць літаратуру, якая адлюстроўвае клясавую барацьбу працоўных дарэвалюцыйнага і пасьлярэвалюцыйнага часу, а таксама і літаратуру, якая ахапляе ўсе галіны сацыялістычнай будоўлі.

Радам адзін каля другога разьмешчаны аддзел мэтадычнай літаратуры, бібліяграфіі і іншай кампілятаваньня.

У цэнтры корпусу знаходзіцца зала чытача на 300 месц. Па бакох—пакоі для асьпірантуры, навуковых працаўнікоў і зала для выстаўкі. Тут будзе знаходзіцца літаратура па пытаньнях навейшых дасягненьняў навукі і тэхнікі.

Насустрач матцы-работніцы

НАРКАМАСЬВЕТЫ ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СЬВЯТ ПЕРАВОДЗІЦЬ РАБОТУ 58 ДЗІЦЯЧЫХ АЧАГАЎ (ПРЫБУЙНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ, ДЗЕ ПРАЦУЕ ШМАТ ЖАНЧЫН) НА ТРЫ ЗЬМЕНЫ. РАЗАМ З ГЭТЫМ 300 ДЗІЦЯЧЫХ САДОЎ ПЕРАВОДЗІЦЦА Ў АЧАГІ.

Дэкаднік супроцьпажарнай аховы

У сувязі са шпаркім ростам прамысловасьці, вялізарным павялічэньнем насельніцтва ў гарадох, значным перасяленьнем жыльлёвай плошчы справа ўзмацненьня супроцьпажарнай аховы прадпрыемстваў гарадоў, а таксама калгасаў і саўгасаў набывае зараз вельмі вялікае значэньне.

У мэтах праверкі стану пра ніяктычных мерапрыемстваў па горадзе і ўсіх населеных пунктах прыгараднага раёну, у мэтах паляпшэньня работы добраахвотных пажарных дружын на ініцыятыве кіраўніцтва менскай пажарнай аховы праводзіцца дэкада супроцьпажарнай аховы. Наконт гэтага гарсавет выдаў адпаведную пастанову.

Дэкаднік па горадзе праводзіцца да 5 лістапада. У рабоце па правядзеньні дэкадніка прымаюць актыўны ўдзел МГПК і МДПД. Папярэднія вынікі ходу дэкадніка паказваюць аб значным паляпшэньні работы гарадской, прафесыянальнай, пажарнай каманды і добраахвотных пажарных дружын прадпрыемстваў.

Паводле папярэдніх падлікаў, хаця выпадкаў пажару ў горадзе за гэты год у параўнаньні з мінулым і больш, але страты значна меншыя. Гэта гаворыць аб тым, што ў рабоце пажарных каманд, галоўным чынам, прафесыянальных, дасягнута большая выразнасьць. Значныя дасягненьні ёсьць і ў справе мэханізацыі пажарных каманд. За гэты год МГПК набыты 4 новыя пажарныя аўтамашыны і рад іншых тэхнічных сродкаў. Дадаткова адкрыта 3-цяя часьць пажарнай каманды.

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б і СНК вызначаны на гэты год 300 тыс. рублёў для абсталяваньня цэнтральнай часьці пажарнай аховы гораду і дадатковага набыцьця тэхнічных сродкаў. Дрэнна толькі, што Менгарсавет нікольні не палікацыўся аб арганізацыі пабудовы цэнтральнай часткі. Гэта работа яшчэ не пачата.

Зварачае на сябе ўвагу нядбайнасьць раду мясцовых вясковых арганізацый прыгараднага раёну да пажарнай справы. Многія калгасы і саўгасы ня трымаюць у пастаяннай гатоўнасьці пажарны інвэнтар. Нярэдкія такія выпадкі, калі пажарныя шопы займаюцца пад склады, а ў бочках возяць ваду на поле ў часе палявых работ.

Дэкаднік супроцьпажарнай аховы на вёсцы, паводле пастановы гарсавету, праводзіцца з 10 па 20 лістапада. У баку ад правядзеньня дэкадніка не павінны застацца ні адна парт'ячэйка і сельсавет прыгараднага раёну. Пажарная справа патрабуе да сябе зараз большай увагі ўсёй грамадзкасьці.

Н.

УМОВЫ ПРЫЁМУ

на 6-месячныя курсы падрыхтоўкі раённага партыйнага актыву пры ЦК КП(б)Б.

1. У мэтах падрыхтоўкі кіруючых працаўнікоў райкомаў КП(б)Б, пры ЦК КП(б)Б арганізуюцца сталыя 6-месячныя курсы.

Курсы камплектуюцца 40 кіруючымі раённымі камсамольскімі працаўнікамі, 150 сакратарамі парт. ячэек і 60 працаўнікамі гаспадарча-кааперацыйных арганізацый.

2) На курсы прымаюцца таварышы па камандыроўках раённых партыйных камітэтаў, прычым устанаўліваюцца наступныя ўмовы прыёму: а) парстаж ка мандураваных павінен быць ня менш 3-х год (для кіруючых камсамольскіх працаўнікоў—ня менш 2-х год), б) стаж партработы—ня менш 2-х год, в) агульнае і палітычнае разьвіцьцё—у абёме вячэрняй саўпартшколы, г) агульная адукацыя—ня ніжэй 4-х груп. сямігодкі (уменьне самастойна выкладаць свае думкі пісьмова, веданьне 4-х дзеяньняў арыфмэтыкі).

3. Пры камплектаваньні курсаў павінен быць захоўван такі склад іх, каб ня менш 70 проц. агульнай колькасьці слухачоў складалі рабочыя па сац. становішчы, ня менш 25 проц. жанчын і 20 проц. слухачоў польскай і латыскай нацыянальнасьцяй.

4. Устанаўляецца наступная расклад ка па камплектаваньні курсаў райпартактыву па раёнах: (з правышэньнем на 20 проц. звыш нормы для адбору).

Назва раёнаў	Усяго з іх	Камсам.	Партыйц.	Безпарт.
Менскі раён	20	4	10	6
Гомельскі	15	3	8	4
Віцебскі	15	3	8	4
Магілеўскі	10	2	5	3
Аршанскі	8	2	4	2
Полацкі	8	2	4	2
Мазырскі	8	2	4	2
Бабруйскі	10	2	5	3
Барысаўскі	8	1	5	2
Лепельскі	6	1	4	1
Шклоўскі	6	1	4	1
Горацкі	5	1	3	1
	119	24	64	31

Усе астатнія раёны камандыруюць па 3 таварышы (1 з іх павінен быць абавязкова сакратаром буйной партыйнай ячэйкі або парткалектыву).

5. Адбор курсантаў праводзіцца райкомамі КП(б)Б і кандыдаты зацьвярджаецца мандатнай камісіяй, якая працуе ў г. Менску ў ніжэйпаказаныя тэрміны: а) 5,6 сьнежня для т. т., камандыраваных раёнамі б. Менскай і Бабруйскай акруг, б) 7,8 сьнежня для т. т., камандыраваных раёнамі б. Віцебскай і Полацкай акруг, в) 9 сьнежня для т. т., камандыраваных раёнамі б. Гомельскай і Мазырскай акруг, г) 10 сьнежня для т. т., камандыраваных раёнамі б. Магілеўскай і Аршанскай акруг. Да паказаных тэрмінаў вылучныя райкомамі т. т. павінны зьявіцца ў арг. інструктарскі аддзел ЦК КП(б)Б.

6. Да 20 лістапада райкомы КП(б)Б абавязкова дасылаюць у арг. інструктарскі аддзел ЦК КП(б)Б дакументы на камандыраваных на курсы: а) анкету, засьведчаную РК КП(б)Б, б) характэрыстыкі, в) камандыроўкі РК КП(б)Б.

7. Заняткі па курсах пачынаюцца 11 сьнежня 1931 г. у 10 гадз. раніцы, для якога тэрміну ўсе адабраныя мандатнай камісіяй курсанты павінны зьявіцца на курсы—тэрыторыя б. выстаўкі, памяшканьне інстытуту маханізацыі.

8. Слухачы курсаў на працягу ўсяго перыяду навучаньня забясьпечваюцца харчаваньнем, інтэрнатам і навучальнымі прыладамі.

9. За ўсімі камандыраванымі таварышамі захоўваецца пэнсія на месцы іх працы.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Шарангэвіч.**

УМОВЫ ПРЫЁМУ

на завочна-кансультацыйнае аддзяленьне інстытуту чырвонай прафэсуры літаратуры, мастацтва і мовы пры Камакадэміі ЦВК СССР.

1. Завочна-кансультацыйнае аддзяленьне інстытуту чырвонай прафэсуры літаратуры, мастацтва і мовы, якое адкрываецца, абслугоўвае завочнікаў 3-х катэгорый: а) якія праходзяць завочную праграму інстытуту, б) якія рыхтуюцца да паступленьня на асноўнае аддзяленьне ІЧП ЛКСМ (прыём на асноўнае аддзяленьне будзе праводзіцца толькі праз завочны ІЧП, згодна пастановы прэзыдыуму Камакадэміі), в) якія кансультуюцца па пэўных пытаньнях на лініі партактыву, і выкладчыкаў вузаў, камвузаў і супроцьпажнікаў дасьледчых інстытутаў.

2. У лік завочнікаў першых 2-х катэгорый **а і б** прымаюцца члены партыі—рабочыя з 6-7 гадовым стажам, сяляне і служачыя з 8-гадовым парстажам (для ўсіх абавязковы стаж грамадзка-масавай работы).

3. Камплектаваньне завочнікаў у ІЧП ЛММ на 1931-32 навучальны год будзе праводзіцца бесьперапынна.

4. Тэрмін праходжаньня завочнага навучаньня ўстанаўляецца 4 гады, прычым т. т., якія з поспехам скончаць першыя два курсы завочнага аддзяленьня і тыя, якія выявілі сябе, як навуковыя працаўнікі, залічваюцца на апошні год у саўгаўдным слухачы ІЧП ЛММ (на 3 курс). Для аплачваных за вулобу арганізацыямі апошнія агаварваюцца ў дагаворы пры яго паджэньні.

5. Камандыраваныя ўстановы і арганізацыі, у якіх працуюць завочнікі, выдзяляюць сродкі на аплату матар'яльных выдаткаў на вучобу камандыраваных т. т. у разьмеры 200 руб. у год на кожнага слухача першай катэгорыі (згодна заключаемых з ЗКА Камакадэміі дагавароў).

6. Завочны ІЧП ЛММ будзе праводзіць прыём на наступныя аддзяленьні: газэтна-рэдактарскае, літаратурна-крытычнае і аддзяленьне мастацтваў (з разьдзеламі кіно, ізо, самадзейнае мастацтва і масава-мастацкая работа: тэатр, музыка, радыё).

7. Літаратурна-крытычнае аддзяленьне разьлічана на падрыхтоўку кадраў крытыкаў, арганізатараў масавага літаратурнага руху, кіруючых работнікаў для рэдакцыйна-выдавецкай работы ў галіне мастацкай літаратуры, выкладчыкаў для вузаў і камвузаў.

Прыём слухачоў на аддзяленьне разьлічан на практычных работнікаў масавага літаратурнага руху, на актыў гурткоў рабочай крытыкі, членаў рабочых рэдкалегій, на кадры практычных работнікаў рэдакцыйна-выдавецкай работы і скончыўшых вузы і камвузы.

8. Газэтна-рэдактарскае аддзяленьне разьлічана на практычных работнікаў абласных і раённых газэт і рыхтуе кіруючыя кадры ў галіне газэтаведаньня, гісторыі друку і выкладчыкаў вузаў і камвузаў.

9. Аддзяленьне мастацтва рыхтуе крытыкаў-арганізатараў, работнікаў па плянаваньні ў асобных галінах мастацтва, выкладчыкаў вузаў.

10. На аддзяленьне мастацтваў прымаюцца практычныя работнікі па асобных галінах мастацтва, рабочыя, актыўныя члены мастацкіх саветаў, кіруючыя работнікі самадзейнага мастацтва і скончыўшыя вузы.

11. Для прыёму на завочнае аддзяленьне па катэгорыі а) т.т. павінны прадставіць у ІЧП ЛММ наступныя дакументы: а) заяву аб прыёме з паказаньнем аддзяленьня, на якое жадае паступіць кандыдат, б) запоўненую анкету слухача ЗКА ЛММ, засьведчаную партыйнай арганізацыяй, в) камандыроўку ЦК УсеКП(б), абкому, крайкому або ЦК нацкомпартыі і камандыроўку арганізацыі, якая бярэ на сябе выдаткі па навучаньні слухача, г) падрабязную характарыстыку ячэйкі, нацыяльнага райкомам, і даведку аб партстажы і сацыяльным становішчы, д) дакументы аб асьвеце для асоб, якія скончылі вузы або камвузы ў 1929-31 г. ў будуюцца вузы працы, калі такія ёсьць.

12. Для прыёму на завочнае аддзяленьне катэгорыі б) акрамя пералічаных дакументаў у § 10 за выключэньнем камандыроўкі арганізацыі, якая бярэ на сябе выдаткі па навучаньні завочнікаў, неабходна даставіць дакументы аб адносінах да вайсковай павіннасьці і даведку аб нараджэньні.

12. Заявы і дакументы неабходна накіроўваць у мандатную камісію ІЧП ЛММ (Масква, Астажэнка, 53).

13. Т. т., якія задавальняюць пастаўленым умовам і якія дапушчаны мандатнай камісіяй ЦК УсеКП(б), прысылаюць кароткія іспытальныя работы па 3 дысцыплінах: дыялектычным матэрыялізьме, палітычнай эканоміі, ленінізьме і па спэцыяльнасьці (тэмы будуць рассылацца па разглядзе заяў).

14. Залічаньні ў лік завочнікаў ІЧП ЛММ па катэгорыі а) праходзяць праграму аналёгічную з праграмай асноўнага аддзяленьня (гл. бюлетэнь завочнага навучаньня ІЧП № 9 і наступныя), прысылаюць на кансультацыю кароткія тэзісы па тэмах і даклады па разьдзелах. Навучальна-праверачныя канферэнцыі для завочнікаў катэгорыі а) будуць склікацца два разы ў год, для ўдзелу ў якіх завочнік атрымлівае паўтарамесячны водпуск па месцы работы з захаваньнем пэнсіі звыш нармальнага водпуску (пасл ЦК УсеКП(б)).

15. Мінімум літаратуры, якая патрабуецца для паступаючых на завочнае аддзяленьне, паралельнае асноўнаму апублікован у часопісі «Большевик» № 10, «На літаратурном посту» № 20-21 і «Бюлетэнь завочнага навучаньня ІЧП» № 6 за 1931 г.

Заўвага: Завочнікі катэгорыі б) праходзяць паказаны мінімум літаратуры на працягу ўсяго навучальнага году.

Дырэкцыя ІЧП ЛММ

Чырв. Зорка (Пач. 7, 8-45, 10-30) — Ладны гукавы фільм Саюзкіно — АДНА

ПРАЛЕТАРЫ (Адкр. з 12 г. дня) — НА ТЫМ БАКУ у 7 частк. Хроніка № 55

„КУЛЬТУРА“ (Пач.: 7, 8-45, 10-30) — Падарожжа Свэн-Гедына па пустынях Цэнтральнай Азіі. Звыш. праграм. —УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ АКАЛЭМІІ НАВУК.

„Інтэрнацыянал“ — Мастацкі фільм Барыслаў сьмяецца. Адкр. з 12 г. дня

„Юкы Піякэр“ (Суднак кіно „Культура“) — Мастацкі фільм МЯЦЕЖ. Звыш праграмы—ХРОНІКА

„СПАРТАК“ Каса адкрыта з 5 г. — Выдатны фільм ГАМБУРГ у 8 частках

ПРЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІМ палітыка-асьветным тэхнікуме (МАГІЛЕЎ, КАМСАМОЛЬСКАЯ, 28)

З 1 студзеня 1932 г. адкрываюцца **3-МЕСЯЧНЫЯ ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ** для веснавога набору ў гэты тэхнікум.

На курсы камандыруюць Райкомы КП(б)Б, КСМ і Райвыканкомы з кожнага раёну ня менш 3-х асоб. На курсы прымаюцца партыйцы, камсамольцы і 10 проц. беспартыйных з адукацыяй ня ніжэй 4-5 груп 7-годкі, узрост ад 17-35 год, са стажам партыйнай, камсамольскай або грамадзкай працы ня менш 2-х год.

На курсах будуць існаваць беларускі, польскі і яўрэйскі сэктары.

Заявы з дакумантамі, камандыроўка, даведкі аб сацыямасавым становішчы, узросьце, здароўі, аб адносінах да вайсковай службы і засьведчаная анкета—прымаюцца **да 15 сьнежня 1931 г.**

Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмеры 30 руб. Пасьцельныя прылады павінны мець свае.

ДЫРЭКТАР ТЭХНІКУМУ **КАПАЕВІЧ.**

Сёньня, 5 лістапада, роўна ў 6 гадз.